Жыві, Беларусь!

Народная газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№ 202 (215) 17 кастрычніка 1991 г. Чацвер.

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1990 ГОДА НА БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАХ.

Кошт: у розніцу — 20 кап. падпісны — 3 кап.

Факты Аргументы Комментарии Суждения

Уверенность подвела

На 15 октября, как известно, было назначено подписание главами государств и правительств суверенных республик договора об экономическом сообществе.

Многие газеты вышли в этот день с броскими заголовками, посвященными предстоящему событию. Нисколько не сомневаясь в том, что договор будет подписан в условленное время, поторопились с сообщением и мы, сотрудники «Народной».

Приносим свои извинения читателям за то, что невольно дезинформировали их — церемония подписания, как следует из сообщений, перенесена на 18 октября.

Новое поколение выбирает хату с краю?

ВИТЕБСК. **Нежелание участвовать в общественной жизни свойственно сейчас абсолютному большинству (94 проц.) местной молодежи.**

К такому выводу пришла независимая социологическая лаборатория «Истина». Опрос, проведенный среди жителей области в возрасте от 14 до 25 лет, выявил также, что по меньшей мере 85 проц. респондентов безразличны к таким понятиям, как честь, достоинство и уважение окружающих. 67 проц. считают, что плодотворные социалистические идеи были впоследствии искажены, но вера в победу социализма отмечена лишь у десятой части молодых сограждан. Важно добавить, что исследование проходило еще по заказу обкома КПБ.

Вкратце

✦ Президент Азербайджана Аяз Муталибов намерен обратиться к Михаилу Горбачеву с просьбой выделить оружие для формирования в республике сил национальной самообороны.

✦ В самое ближайшее время Республикой Латвия будут назначены послы за рубежом: в Москве, Вашингтоне, Брюсселе, Бонне, Париже, Лондоне, Стокгольме и Праге.

✦ «Почти 90% членов российского правительства не соответствуют занимаемой должности из-за своей некомпетентности и непрофессионализма», — заявил народный депутат СССР Михаил Бочаров.

▲ VI пленум ЦК ЛКСМБ постановил созвать XXX съезд ЛКСМБ 6 декабря с.г. в г. Минске. Пленум принял также обращение к Верховному Совету Республики Беларусь, в котором говорится о необходимости быстрейшего прекращения работы Чернобыльской АЭС, как постоянного источника радиационной угрозы.

Судьба тележурналистов остается загадкой

Командование Югославской народной армии, служба контрразведки пятого корпуса ЮНА помогли корреспондентам «Инфо-нова» побывать в лагере для военнопленных, который находится в горах Боснии.

Из свидетельств военнопленных, в частности бывшего командира подразделения хорватской национальной гвардии Звонимира Калана, вытекает, что собкоры советского телевидения Виктор Ногин и Геннадий Куренной 1 сентября находились в городе Хрватска Костайница, который тогда контролировался подразделениями хорватской гвардии и частями министерства внутренних дел Хорватии.

Судя по всему, последнее интервью В. Ногина и Г. Куренного было сделано именно с З. Каланом. По показаниям военнопленных, советские журналисты больше не покидали района Костайницы. Сами же хорватские гвардейцы были взяты в плен 12 сентября.

По предположениям, автомобиль, на котором Н. Ногин и Г. Куренной достигли Костайницы, был обстрелян и сожжен в трех километрах от города, но тележурналистов в нем в тот момент уже не было.

Получены и другие важные данные, которые, однако, требуют тщательной проверки. Таким образом, дальнейшая судьба В. Ногина и Г. Куренного по-прежнему остается загадкой.

Детективная история с трагической развязкой

Новый начальник ГУВД Москвы Аркадий МУРАШЕВ впервые выступил в роли детектива.

Он принял участие в осмотре места, где ночью 14 октября разыгралась трагедия со смертью и ранениями.

А она началась так. В столичное кафе «Виктория», куда заглянули участники советско-американской деловой встречи, проник через черный ход неизвестный мужчина и внезапно открыл огонь из пистолета по присутствующим. Затем бросил гранату и скрылся. В результате один человек погиб, шестеро ранено.

Среди раненых —гражданин США.




Рисунок Михаила Даниленко. Тема Сергея Валентеенко.

«Коммерсантъ» толстеет!

В этом лично убедились приглашенные на презентацию в Минске Белорусского информационного центра известного еженедельника.

В фойе гостям совсем задаром раздавали экземпляры первого, экспериментального номера, вышедшего вдвое большим, чем прежде, объемом — на 32 страницах. Не умаляя внимания к бизнесу, издание будет теперь рассказывать и о культуре, международной политике, спорте... А новоиспеченный Белинформцентр намерен регулярно питать московскую редакцию разнообразными сообщениями и комментариями о деловой и прочей жизни в суверенной Беларуси. Теперь ведь в столице нашей республики будет действовать уже не просто группа собственных корреспондентов, а солидная фирма с правами юридического лица и весьма многообещающими перспективами. Так что журналистам белорусских изданий и агентств придется изрядно попотеть, дабы не остаться с носом в конкуренции за самый ходовой ныне товар — «горячую» информацию.

Откалывают номера

Неспокойно в эти дни на территории Борисовской автобазы № 70. 15 октября, например, рабочие заблокировали ворота предприятия и не выпустили автомобили, предназначавшиеся на продажу.

Суть ситуации вкратце такова: большинство водителей автобазы, еще два года назад входившей в состав треста «Белдорстрой», сейчас находится в подчинении «Смоленскдорстроя», и распорядок их работы выглядит так: 15 дней работы на строительстве дорог Смоленской области, 15 — отдых дома, в Борисове. Тут же находится и управление автобазы.

Но вот объявлена независимость республик, и надумали смоленские начальники перегнать технику белорусского филиала в свой город. Кое-что продать, а на иных машинах поставить номера Смоленщины.

Нетрудно предугадать, что ожидает в этом случае борисовских шоферов: несогласных с начальством уволят сразу, о судьбе остальных, может, еще подумают. Если не посчитают за лучшее посадить за баранки своих земляков.

Понятно, что такие перспективы не радуют земляков наших, вот и протестуют они, заявляя: «Хотим работать в Беларуси и для Беларуси».

Хочешь талоны — садись на иглу

ЧИТА. **С весны в городе начали выдавать талоны на основные продукты питания для детей в возрасте от одного до трех лет.**

Эти талоны использовались и используются главным образом для приобретения молока и молочных продуктов, дефицит которых в городе усиливается. Это обстоятельство своеобразно решила использовать заведующая отделением детской поликлиники № 1 Журавлева, которая отказывает в выдаче молочных талонов тем ребятишкам, которые не имеют необходимого набора прививок.

Своя рука — владыка

МОСКВА. **Распоряжением мэра города Г. Попова установлены должностные оклады чиновникам новой исполнительной власти.**

Месячный оклад премьера московского правительства — 2300 рублей. Не менее 2 тысяч рублей в месяц будут получать кабинетные работники мэрии, занимающие должности заместителей премьера, префектов административных округов.

Оклад высокопоставленного чиновника мэрии примерно в пять раз выше среднего заработка квалифицированного рабочего, в восемь раз — рядового московского инженера.

«Кто в седле, тот воин», — горько шутят рядовые москвичи. Они имеют в виду и неразбериху с приватизацией государственной собственности по вине властей. Недавно стало известно, например, что в результате чиновничьих комбинаций с коллективным предпринимательством на Первом московском часовом заводе заработок директора составил шесть миллионов рублей за год!

Внутривенный десерт

УДМУРТИЯ. **Дети из поселка Бага Сарканского района скупили в местной аптеке весь запас глюкозы в ампулах.**

Не шалости ради. Просто они хотят сладкого, а конфет здесь давно не продают.

Выпуск подготовлен по сообщениям Алеся СИВОГО, Сергея БУТКЕВИЧА, Анатолия ГОТОВЧИЦА, Леонида ФАДЕЕВА, Владимира АЛЕКСАНДРОВА, агентств «Инфо-нова», «Уралакцепт», «БелаПАН».

«Горячий» телефон 32-24-02 работает ежедневно с 9 до 11 часов.

ДУМА ПРА БЕЛАРУСЬ







Фота Васіля ЗЯНЬКО.

На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

«Ці маеце маральнае права?»

Вечарам у аўторак у залу пасяджэнняў, калі можна так сказаць, была ўнесена сімвалічная службовая лесвіца. Два чалавекі, атрымаўшы давер Вярхоўнага Савета, павінны былі зрабіць значны крок наперад у сваёй кар'еры: адзін — на пасаду першага намесніка Старшыні ВС, другі — на пасаду Генеральнага пракурора рэспублікі.

Станіслаў Шушкевіч вёў выбары, вобразна кажучы, з адкрытымі картамі: найбольш падыходзячай кандыдатурай у свае бліжэйшыя паплечнікі ён называў старшыню Віцебскага аблвыканкама Кулакова. Але Уладзімір Панцялеевіч не згадзіўся мяняць Віцебск на сталіцу.

Пасля катэгарычнай адмовы была названа кандыдатура Аляксандра Саснова, старшыні пастаяннай Камісіі па пытаннях працы, цэн, занятасці і сацыяльнай абароненасці насельніцтва. Аляксандр Віктаравіч асабіста мне вядомы як палітык са сваім светапоглядам, незалежнасцю меркаванняў, уласнай эканамічнай праграмай.

Як і меркавалася, кандыдата на высокую пасаду сустрэлі ў зале па-рознаму. Адны, як Леанід Звераў, Мікалай Скарынін, Алег Трусаў, Уладзімір Цялежнікаў, Станіслаў Бабачонак, падтрымалі Аляксандра Саснова, называючы шэраг яго станоўчых якасцей. Другія сядзелі моўчкі, але, відаць, думалі: не, нам такі кандыдат не падыходзіць, што гэта за фігура — аспірант, асістэнт, выкладчык, — няма ў паслужным спісе ніводнай значнай пасады.

Сапраўды, па правілах наменклатуры Аляксандр Сасноў крочыў не так. Узнікае пытанне, чаму ж ніхто з яго апанентаў не выказаў услых сваіх пярэчанняў, маўляў, не падыходзіце вы, Аляксандр Віктаравіч, а вы, Станіслаў Станіслававіч, памыляецеся, робячы на яго стаўку... Нічога падобнага, камуністычная большасць больш звычная да закулісных ціхіх хадоў. Толькі Іван Каратчэня адкрыта выказаў пажаданне, каб побач са Старшынёй сядзеў прадстаўнік кампартыі, інакш згоды ў парламенце не будзе ніколі. Ды яшчэ дэпутат Уладзімір Самашчаў выказаў сваю прэтэнзію...

Галоўнае ж — ужо загадзя было вызначана, што «не наш чалавек» не пройдзе. І ўсё ж 144 галасы «за» — гэта значная лічба, сведчанне высокага аўтарытэту 44-гадовага дэпутата.

Наступным трымаў экзамен Мікалай Ігнатовіч. Народны дэпутат СССР, высокапрафесійны следчы, вядомы па раскрыццю віцебскай справы забойцы Міхасевіча, стойкі змагар з усялякімі прывілеямі, ільготамі на саюзным узроўні...

Ясна было, што многія дэпутаты падтрымаюць кандыдатуру на пасаду першага ў гісторыі Беларусі Генеральнага пракурора. Ім было што сказаць. Мяне ж асабліва цікавіла, як будуць дзейнічаць праціўнікі Мікалая Іванавіча?

У загаловак гэтай справаздачы вынесена пытанне, якое задаў Ігнатовічу першы сакратар Акцябрскага райкама КПБ—КПСС, дэпутат Мікалай Судас: «Ці маеце вы сёння маральнае права прэтэндаваць на пасаду Генеральнага пракурора, калі менавіта па вашай віне было незаконна асуджана 5 чалавек, і яны прасядзелі больш чым па два гады ў зняволенні?»

Задума дэпутата з Гомельшчыны была яснай, яго пытанне можна параўнаць з чырвонай галавешкай, якую ён кідаў у бок ёмкасці з бензінам. Кідаў, ды не дакінуў. Дэпутаты не паддаліся эмоцыям. Папершае, сам Ігнатовіч даў грунтоўнае тлумачэнне, падругое, ясная, сумленная пазіцыя прэтэндэнта выклікала ў многіх сімпатыю. У многіх, канешне, не азначае, што ва ўсіх. Напрыклад, той жа самы Уладзімір Самашчаў, нягледзячы на ўсе важкія довады, заявіў: «Ну, не магу я галасаваць за гэту кандыдатуру. Я не ведаю яго... Калі на ўсю рэспубліку кажуць: пасадзіў пяць чалавек, трымаў два гады...»

Дарэчы, не было злашчасных двух гадоў, было два тыдні, на якія былі арыштаваны падазраваемыя ў жорсткім забойстве людзі. Тым больш дзіўная логіка ў шаноўнага Уладзіміра Васільевіча. Тое, што ён мала ведае Ігнатовіча, праўда, не вельмі здзіўляе, ён у Беларусь прыехаў з Масквы на працу ў ЦК КПБ, і выбаршчыкі Глускага раёна, хаця і не ведалі Самашчава, аднак выбралі яго сваім дэпутатам.

Усё ж трэба думаць і аб тым маральным праве, а ці варта задаваць тое ці іншае скандальнае пытанне.

Тактыка процістаяння сама па сабе з'ява звычайная, прыкра тое, што свайго апанента некаторыя дэпутаты імкнуцца зняславіць, справакаваць. Старшыня пастаяннай Камісіі Мечыслаў Грыб (чалавек, на мой погляд, справядлівы і памяркоўны) зачытаў дэпутатам ледзь не цэлы даклад аб праверцы тэлеграмы грамадзяніна Лукашэвіча, нацэленай супраць Ігнатовіча. Змест выступлення, як мне здалося, быў зігзагападобны, ён не абвінавачваў моцна прэтэндэнта, але і не абараняў яго.

Мяне зацікавіла іншае: адкуль узялася тая тэлеграма? Як грамадзянін Лукашэвіч даведаўся, што народнага дэпутата СССР у Вярхоўным Савеце Беларусі збіраюцца вылучаць на высокую пасаду? На маё разуменне, нехта пасігналіў таму грамадзяніну, выклікаў тэлеграму, справакаваў праверку... На жаль, у нашым грамадстве, неабцяжараным высокімі маральнымі якасцямі, такое магчыма. Тым не менш дэпутаты абралі Мікалая Ігнатовіча Генеральным пракурорам.

Учора раніцай пачалося вельмі зацікаўленае абмеркаванне законапраекта аб грамадзянстве, не за гарамі тая пара, калі мы атрымаем магчымасць з гордасцю сказаць: «Я — грамадзянін Рэспублікі Беларусь!» Перад дэпутатамі з падрабязнай справаздачай аб дзейнасці ўрада выступіў прэм'ер-міністр Вячаслаў Кебіч.

Мікалай ГАЛКО.





Настроение бодрое—идем ко дну?

Если действительно театр начинается с вешалки, то трижды прав Станиславский, подметивший это! Около 10 утра, перед тем как начинается работа сессии, неподалеку от главной сцены, на площади перед Домом правительства открывается свой маленький театрик. Стучат молотки бутафоров, сооружаются декорации. Глядя на них, легко определить повестку дня сессии. Если почем зря кроют Кебича, значит, в Овальном зале предстоит его доклад. Если на плакатах начертано нечто о «ГКЧП профсоюзов» — значит, площадь уже отреагировала на митинг, организованный профсоюзами.

Площадная лексика крута и увесиста, как булыжник, а голос народа, увы, не всегда голос Божий...

Но так или иначе голос площади доносится до амфитеатра, где располагаются народные депутаты. Правда, реакция многих из них совсем не адекватна царящим на площади настроениям.

Депутаты в меру своего разумения творят политику...

В чем заключается искусство политика? Если только в констатации известных истин и готовности сообщить о них аудитории, то наша страна — без сомнения, страна великих политиков. На каждой кухне каждая критически мыслящая теща может дать емкую и точную оценку действительности. Слабость кухонных стратегов заключается, правда, в отсутствии дара предвидения, в неумении предугадать возможное развитие событий.

Отсутствие государственного мышления, к сожалению, порой прямо-таки зримо витает и под высокими потолками Овального зала. Во вторник это особенно четко проявилось при обсуждении необходимости создания военного ведомства. Депутаты, едва не заблокировавшие это решение, мне кажется, просто не в силах осмыслить его важность. Зато забаллотировать кандидатуру заместителя Председателя Верховного Совета, куда предлагался Соснов, — здесь единодушие нашлось! Казалось бы, как можно не понимать того, что сегодня нам необходим человек серьезных экономических познаний, что не проповедники левых или правых взглядов, а экономисты нужны нашему парламенту! Но как соблазнительно нажать на кнопку, не задумываясь о последствиях этого легкого физического действа... Кстати, как и положено в театре, при всем этом присутствовала занимательнейшая интрига. Никто не высказался против Соснова вслух, зато на кнопки нажали дружно. Потом, полагаю, многие подходили, утешали и уверяли, что голосовали «за»...

«О, времена, о, нравы!», — восклицали в аналогичных случаях древние, но все равно умные римляне.

Всеобщий интерес в кулуарах сессии вызывает народный депутат из-под Орши отец Виталий. На нем такой роскошный клобук да еще в сочетании с огромным золотым крестом, что даже убежденные атеисты поглядывают на своего коллегу с почтением.

— По какому случаю такой парад? — интересуюсь у отца Виталия.

— Обычное дело, — отвечает отец Виталий, — как говорится, монашеская форма одежды. Положена по чину.

В непринужденной беседе узнаю много интересного. Пока мы суетимся в снискании хлеба насущного, отец Виталий успевает позаботиться и о душе. Своей и прихожан. Только что вернулся из Афонского монастыря, окреп духом, получил благословение Великого старца Паисия. Применительно к мирским делам это означает, что бывшим оршанским партбоссам и перекрасившимся совбурам предстоят нелегкие дни. Народный депутат не уповает на молитвы, а вкупе с прокуратурой разворотил один муравейник местного значения по незаконному распределению машин начальству. В ближайших планах — новые активные шаги по защите интересов мирян.

— Отец Виталий, — говорю я, — у нас, несмотря на демократию, не чтут правдолюбцев. Вспомните, пожалуйста, чем закончил отец Мень...

На это отец Виталий ничего не ответил и поспешил в Овальный зал слушать доклад В. Кебича. Доклад вы сможете прочитать в нашей газете. На меня произвело глубокое впечатление, что Вячеслав Францевич читал его бодрым голосом. Поскольку речь в докладе все-таки шла о вещах не совсем веселых, то выдержка и самообладание нашего Председателя впечатляют и обнадеживают.

Во второй день на сессии ничего значительного, пожалуй, и не произошло... Все впереди.

Павел ЯКУБОВИЧ.

Лісты парламенту і ўраду

Пра «малую зямлю» пенсіянераў і іх галодных бычкоў

Тыя, каму за пяцьдзесят, яшчэ памятаюць, як прысядзібная зямелька карміла больш дзесяці пасляваенных гадоў усё вясковае насельніцтва, бо ў калгасе тады за працу анічога не плацілі. Ды і гораду перападала. Па 50 кілаграмаў мяса ды па 300 літраў малака павінны былі здаваць дзяржаве. Усё з тых сотак.

Бывала, гуртуюцца вясною па шэсць жанчын: пяцёрка ўпрагаецца ў плуг, а шостая за плугам... І садзяць бульбу. Але толькі раніцай ды ўвечары (днём — у калгасе). Сёння — адной, заўтра — другой. Так за тыдзень, бадай, і адсяваліся.

Абжывацца сталі людзі. Ужо і на базар пачалі выкідваць то бульбачку, то парсючка, каб капейку якую на адзежыну ды абутак мець. А калгасы аніяк не ачухаюцца. Што з імі ні рабілі: узбуйнялі, разбуйнялі, пераваралі ў саўгасы, давалі крэдыты, «спісвалі»...

І тут нечая галава зварыла, што прычынай усяго — прыватныя падсобныя гаспадаркі калгаснікаў. Навошта, маўляў, яму рупіцца аб калгасе, калі са свайго прысядзібнага жыве, як кароль. Гадуе свіней, кароў, іх прадае, грошы мае. Прыціснуць, абрэзаць, абмежаваць! Перайсці на грашовую аплату!

І прыціснулі. Не болей адной каровы, не болей адной свінні. Прысядзібныя ўчасткі абрэзалі: у каго дзесяць, у каго пяць, а то і паўсоткі.

«Малая зямля» практычна як бы перастала існаваць, даваць прыбытак, карміць людзей. З ёю расправіліся, як раней з «кулацкімі» гаспадаркамі. Цяпер новае пакаленне калгаснікаў не вельмі дбае пра падсобку, пра прысядзібныя соткі, пра парсючка там ці кароўку. Ды і зямлю ў аднаасобнае карыстанне наўрад ці возьме.

А як пенсіянеры, звыклыя да працы, да свайго? Ім горш, проста гора. Для старшыні-дырэктара яны проста абуза, лішнія, непатрэбныя людзі. (Толькі пад час гарачай пары — уборкі — і пра іх успамінаюць.) А так... Карову, калі хочаш, трымай. Могуць выдзеліць колькі там сотак атавы. Але хто скосіць, высушыць, хто прывязе? А вясной? Гною, тарфяной жыжкі той выпішуць. А даставіць, калі дамовішся з трактарыстам, можна толькі пасля работы. Аб пасадцы бульбы ці пасеве ячменю — толькі пасля калгаснага.

Да таго ж яшчэ, калі хто з пенсіянераў выгадуе бычка ці парсючка на продаж, то калгас яго проста аграбіць — заплаціць трошкі і тут жа перапрадасць дзяржаве ўдвая даражэй.

Дык ці не пара павярнуцца тварам да пенсіянера, да яго прысядзібных сотак? Каб не прасіць-угаворваць старшыню-дырэктара, а прыняць урадавую пастанову, па якой ён абавязкова будзе дапамагаць і цяглом, і тэхнікай. Ураджай на гэтай «малой зямлі» павінен цікавіць усіх не менш, чым на вялікай. З аднаго боку, гэта будзе клопат пра тых, чыімі рукамі з пасляваеннага нічога была ўзведзена цяперашняя калгасна-саўгасная гаспадарка, а з другога — атрыманы лішак прадукцыі пакрые яе дэфіцыт і ў горадзе.

Калі гэтага не зрабіць цяпер, то яшчэ на год забяспечым для сябе нішчымніцу. Перакладваць усё на сельскія Саветы ці таварыствы няма сэнсу, бо толькі гаспадаркі, якія маюць усё неабходнае для сельгасработ, могуць дапамагчы.

Іван НАВІЦІН.
Лагойскі раён.

Письмо 616-ти

Крик из зоны

В редакцию поступило обращение, подписанное 616 заключеными оршанской колонии. Как нередко бывает в нашей почте, письмо заодно адресовано и Верховному Совету республики.

Существующие в лагерях порядки, говорится в обращении, приводят к полному распаду личности, развивают в человеке звериные начала. Советские исправительные учреждения занимаются ни чем иным, как постоянным воспроизводством преступности. Некоторые из нас, пишут зэки, еще не потеряли надежду вернуться к нормальной жизни полноценными людьми.

В письме содержатся и требования к белорусскому парламенту. Вызревшие за колючей проволокой идеи, впрочем, далеко не новы и давно уже высказывались критиками советской пенитенциарной системы. Как же видят реформу исправительной системы сами заключенные?

Прежде всего в скорейшем принятии новых основ уголовного и уголовно-процессуального законодательства — соответствующих лучшим международным стандартам. Принудительный труд должен быть отменен и заменен добровольными трудовыми соглашениями. Давно пора при оплате труда использовать расценки соответствующих гражданских министерств и упразднить грабительское 50-процентное отчисление заработка осужденного, считают 616 подписавшихся. Парламентариев призывают также следить за соблюдением ратифицированных СССР международных конвенций по правам человека.

Итак, бурные процессы, происходящие в нашем обществе, пробудили некоторые надежды и по ту сторону тюремных заборов. В зонах неспокойно. И появления подобных петиций можно ожидать во множестве. Как ни относись к требованиям заключенных, но вопросы, которые они ставят, способны поставить в тупик не одного юриста. Осужденные именем БССР, которой ныне уже нет, по законам, несовершенство которых все признают, — они продолжают отбывать свои сроки в том самом ГУЛАГе, с проклятий в адрес которого начиналась политическая карьера многих сегодняшних демократов.

Игорь ФИЛИПЕНКО.

Прыслухайцеся!

«Нехрышчоны» сцяг

Беларусь дачакалася гістарычных сімвалаў. Першыя асобы нашага парламента паабяцалі, што ва ўрачыстай абстаноўцы адбудзецца змена дзяржаўных сімвалаў. І вялікім было маё здзіўленне, калі бел-чырвона-белы сцяг без належнай працэдуры на наступны дзень ужо быў вывешаны.

Але не толькі ў гэтым справа. **Яна і ў тым, што наш галоўны дзяржаўны сцяг застаўся «нехрышчоным»! Бо такая працэдура змены штучнага сімвала на кроўны нацыянальны павінна адбывацца пры непасрэдным асвячэнні яго святарамі ўсіх канфесій Беларусі.**

На мой погляд, неабходна неадкладна правесці гэтую акцыю з прыцягненнем да яе святароў праваслаўнай, каталіцкай, уніяцкай, пратэстанцкай і іншых хрысціянскіх канфесій.

Анатоль МЯЛЬГУЙ.

Разоблачение

Как полковник Срибный с Президентом Горбачевым расставался

Первый день путча по-разному был встречен разными людьми. Кто протестовал, а кто... Впрочем, давайте обратимся к документам, которые имеются на этот счет в нашем распоряжении.

Из объяснения старшего сержанта милиции, командира отделения по охране здания Минского УВД Царикевича Сергея Трофимовича:

«19 августа 1991 года примерно в 9 часов 45 минут через постового милиционера меня вызвал к себе в кабинет заместитель начальника УВД полковник милиции Срибный И. М.

Когда я прибыл к нему в кабинет, Срибный И. М. приказал мне взять и унести из его кабинета портрет Президента СССР Горбачева М. С., который ранее находился у Срибного И. М. в кабинете на стене, но к моему приходу он уже был снят и стоял на полу возле шкафа.

Я взял указанный портрет и унес к себе в кабинет».

Видимо, очень уж не по нраву был Генеральный секретарь КПСС преданному коммунисту-ленинцу Срибному И. М., если он прямо с утра, не дожидаясь по привычке соответствующих решений пленумов и съездов, турнул портрет Горбачева подальше.

Кто знает, может, уже метили на это место портреты Янаева, Крючкова, Пуго? Впрочем, о том, кого хотел водрузить на место Горбачева полковник Срибный в соответствии со своими идеологическими убеждениями, надо полагать, сам расскажет читателям «Народной газеты».

Сергей АНТОНЧИК,
народный депутат Республики Беларусь.

Прывілеі без рэтушы

Хто не роўна дзеліць?

Суботнімі ранкамі тысячы мінчан спяшаюцца на прыгарадныя аўтастанцыі, каб хутчэй дабрацца да сваіх дачных надзелаў. Аўтастанцыя «Маскоўская» ў гэты час нагадвае месца правядзення шматлюднага мітынгу, дзе разам надрываюць галасы дзесяткі прамоўцаў, але ўсе яны крычаць пра адно:

— Да якога часу з нас будуць здзекавацца!?

Згодна з існуючымі правіламі, у аўтобусах прыгарадных зносін тыпу «ЛАЗ» дазволена перавозіць не больш як 67 пасажыраў. І, зразумела, у касах больш білетаў не прадаюць. Але запаўняюць іх, што называецца, па плешку. Калі не тут, то ўжо на наступным прыпынку ля Камароўскага рынку. Ну, напрыклад, аўтобус «Мінск — Жукаўка» 21 верасня цалкам запаўняўся яшчэ на месцы на ўсе пяць рэйсаў.

Амаль немагчыма дабрацца з гэтых дачных пасёлкаў у Мінск у нядзелю пасля абеду. На прыпынку «Паперня» аўтобус часта нават не спыняецца. І пасажыры за шчасце лічаць, калі ўдасца дабрацца дадому да цямна, стоячы хоць бы на адной назе.

Але ёсць кагорта пасажыраў, якім гэтыя дарожныя пакуты не вядомы. Калі зірнуць на расклад руху аўтобусаў, што вісіць на прыгараднай аўтастанцыі «Таварная», то міжволі кідаецца ў вочы, што час адпраўлення ў рэйс аўтобусаў толькі аднаго маршруту займае амаль паўпланшэта. Гэта маршрут «Мінск — Атоліна».

Першы рэйс выконваецца ў 5 гадзін раніцы, а апошні — у 00.20, што само па сабе унікальна. На працягу дня атолінцы могуць выбраць любы з сарака(!) рэйсаў. Гэта па будных днях. Такой інтэнсіўнасці руху, можна сказаць з упэўненасцю, няма ні на адным прыгарадным маршруце ў рэспубліцы. «Мінск — Станькава», напрыклад, курсіруе толькі пяць, а «Мінск — Матэль» — сем разоў у дзень.

Такі камфорт дорага абыходзіцца дзяржаве. Па маршруту «Мінск — Жукаўка» на адлегласці, раўназначнай адлегласці да Атоліна, 21 верасня выручка склала прыкладна ўтрая большую суму, чым на атолінскім.

За 6 месяцаў сёлетняга года страты на маршруце «Мінск — Атоліна» склалі 70.392 рублі. За год трэба чакаць тысяч сто сорак. І пакуль у аўтагаспадарцы асаблівых клопатаў на гэты конт не адчуваецца. Можна здагадвацца чаму. Бо нават, калі аўтобусы будуць хадзіць пустымі, начальства, відаць, не дазволіць зменшыць колькасць рэйсаў. Уся справа ў тым, што ў Атоліна размяшчаюцца пансіянат і дачныя ўчасткі работнікаў Цэнтральнага Камітэта КПБ.

Цікава было б даведацца, якімі такімі «навуковымі» вывучэннямі пасажырапатоку кіраваўся той чалавек, які складаў расклад руху? А мо гэты самы расклад складалі ў ЦК КПБ?

Іван ГЕРАСЮК.

Деловой разговор

ХОТИТЕ ЖИТЬ ХОРОШО? МЫ ВАМ ПОМОЖЕМ!

Белорусская агропромышленная биржа — ваш надежный лоцман в рыночном море

Биржевое движение в Республике Беларусь, возродившееся немногим более полугода назад, стремительно развивается. Не остался в стороне и аграрный сектор. Уже почти месяц, как создано и работает акционерное общество «Белорусская агропромышленная биржа».

Белагропромбиржа была учреждена для создания реальных предпосылок внедрения рыночных отношений в сельском хозяйстве и содействия в развитии всех предприятий агропромышленного комплекса. Эти цели впервые ставятся сегодня в таком новом качестве —непривычном для сохраняющихся административных структур. Раньше все действительно выглядело проще: установлены административные связи сельского хозяйства с промышленностью, централизовано обеспечение материальными ресурсами, фиксированы цены на промышленную и сельскохозяйственную продукцию.

Однако в последние годы по известным всем причинам производители сельскохозяйственной продукции поставлены в неравные условия по отношению к обслуживающим их и производящим машины и оборудование предприятиям. Не находя должной поддержки органов государственного управления республики и на местах, аграрники вынуждены защищать себя сами. Это и послужило одной из главных причин создания Белагропромбиржи.

Словом, впервые за долгие годы в аграрном секторе республики реализована на практике идея многих прогрессивных хозяйственников и ученых о создании мощного центра, способного «сводить» воедино в одном месте производителей и потребителей сельскохозяйственной продукции, машин, механизмов и оборудования, самим осуществлять практическую координацию ценовой политики в целом по республике без вмешательства и подсказок так называемых вышестоящих органов управления.

И это не просто слова—ведь 80 крупнейших учредителей Белагропромбиржи являются гарантией ее выживания в условиях формирующегося рынка, надежности и перспективности. Колхозы «Рассвет» имени Орловского Кировского района и «Советская Белоруссия» Каменецкого района, колхоз-комбинат «Прогресс» Гродненского района и еще более 50 хозяйств, представляющих все без исключения области и крупные районы, Белорусский республиканский сбербанк и Белорусский агропромбанк, крупнейшие перерабатывающие, обслуживающие, строительные и научные объединения и предприятия —таков далеко не полный перечень учредителей биржи.

Несложно заметить, что «производственный профиль» учредителей биржи самый разный— от производства и переработки сельхозпродукции до коммерческой деятельности. И это не случайно: именно универсальность является главной отличительной чертой Белагропромбиржи и дает твердые гарантии ее клиентам на будущее.

Сотрудничество с Белагропромбиржей дает ряд существенных преимуществ тем организациям, которые активно стремятся покупать и продавать на бирже. Во-первых, на нашей бирже действует одна из наиболее низких процентных ставок отчислений бирже за совершенные сделки — 0,4 процента с продавца и 0,6 — с покупателя от суммы заключенной сделки. В дальнейшем, по мере роста объемов реализованных товаров, биржа будет стремиться уменьшить и эти достаточно приемлемые цифры с тем, чтобы создать максимально льготные условия для продавцов и покупателей.

Во-вторых, наша биржа благодаря широкой поддержке учредителей предлагает клиентам без преувеличения широчайший выбор сельскохозяйственной продукции, машин, оборудования, строительных и горюче-смазочных материалов, товаров народного потребления.

Например, только на первых торгах было предложено к продаже 17 видов картофеля. По нашим прогнозам, сумма предложений будет утраиваться каждую неделю, а объем заключенных сделок за этот же период — удваиваться.

Соответственно будет возрастать и разнообразие предлагаемой продукции. Уже сегодня многие предприятия общественного питания с удовольствием приобретают на нашей бирже через брокерские конторы форель, карпа и другие деликатесные в наших условиях продукты питания. Этот список можно продолжить, поскольку ряд товаров, продаваемых сегодня на Белагропромбирже, действительно уникален и ждет своего покупателя.

В-третьих, биржа располагает уникальной информацией о рыночных ценах на самую разнообразную продукцию и, конечно, о реальных ценах на все без исключения продукты сельского хозяйства. Эта информация предназначена для акционеров биржи и действующих брокерских контор, что позволяет им оперативно находить клиентов и заключать выгодные сделки. И, наконец, биржа содействует установлению деловых контактов между клиентами, способствует взаимопониманию между ними, т. е. в конечном счете формирует деловую среду, где главными гарантиями успеха сделок становятся доверие между клиентами, порядочность и честность.

Особо замечу, что разветвленная сеть брокерских контор биржи позволяет оперативно предлагать любую продукцию в любом регионе Республики Беларусь. Руководство биржи будет и дальше активно содействовать привлечению к сотрудничеству с нами новых брокерских контор. В ближайшее время их количество достигнет 800—1000. Поставлена задача в течение одного-двух месяцев соединить в компьютерную сеть все наши брокерские конторы, что позволит им оперативно получать информацию и принимать деловые решения.

На сегодняшний день на бирже активно продаются брокерские места. Для предприятий агропромышленного комплекса создан льготный режим. Продажа или сдача в аренду брокерских мест производится на конкурсной основе. Уже сейчас очевидно, что покупка мест на бирже является наиболее выгодным вложением капитала, так как страхует накопления от инфляции и дает возможность быстро окупить затраты. Основания для такого утверждения имеются — проведенные торги показали, что активно действующая брокерская контора реально способна продавать товара на 600—800 тысяч рублей за одни торги.

Это означает, что выручка брокерской конторы при среднем проценте комиссионного сбора в 4—6 процентов составляет 28—30 тысяч рублей, за месяц — 100—120 тысяч рублей. Как видно из этих расчетов, срок окупаемости временного брокерского места на нашей бирже может составить всего лишь месяц для активно действующих членов биржи и 2—5 месяцев — для менее активных брокеров. Учитывая этот факт, становится понятным интерес к приобретению брокерских мест на Белагропромбирже.

У нас сегодня можно продавать по рыночным ценам сельскохозяйственную продукцию, произведенную сверх госзаказа. В дальнейшем можно ожидать уменьшения размера госзаказа и резкого сужения сферы административного регулирования цен на сельскохозяйственные продукты, что позволит вовлечь в биржевой оборот новые группы товаров и способствовать активному становлению рыночных отношений в агропромышленном секторе республики.

Кроме того, ожидается существенное сокращение фондовых поставок и увеличение объема промышленной продукции, реализуемой по свободным ценам через биржи. В этих условиях резко возрастает значение информации о положении на рынке сельскохозяйственной продукции, о ценах на нее и возможном развитии ситуации в сельском хозяйстве, которую мы будем регулярно готовить и предоставлять.

По-видимому, в той или иной форме будет решен вопрос о лицензировании вывоза продукции, продаваемой на Белагропромбирже, за пределы республики. Мы очень надеемся, что Совет Министров Республики Беларусь ускорит решение этого вопроса, а Верховный Совет примет законодательные акты, регламентирующие права и обязанности биржи, механизм их действия, снимет препятствия на пути их развития.

В ближайших планах — установление деловых контактов с биржами и предпринимателями России, Украины, Средней Азии, других республик и зарубежных стран, проведение учебы брокеров и расширение числа услуг, предоставляемых постоянным клиентам, привлечение новых акционеров.

На бирже создан отдел ценных бумаг и недвижимости, который будет осуществлять разнообразные фондовые операции — покупку и продажу ценных бумаг, их котировку, выпуск акций, займов и их размещение для аккумулирования инвестиционных ресурсов. Мы знаем, что это направление деятельности является перспективным и привлекательным для многих предприятий и деловых людей — это позволяет рассчитывать на их поддержку. **На нашей бирже вы можете выгодно купить или продать здания, сооружения, складские помещения, квартиры и другую недвижимость, а также заключить сделки по их аренде. Это доступно как предприятиям, так и отдельным гражданам.**

Одной из наиболее важных функций биржи сегодня является привлечение ресурсов для сельского хозяйства и промышленности из-за пределов Республики Беларусь. В этом направлении ведется интенсивная работа по привлечению партнеров и изысканию товаров для организации обмена на остродефицитную для нас продукцию. В этой связи биржа вышла с предложением в Совет Министров и Министерство сельского хозяйства и продовольствия о выделении части товаров из фонда стабилизации рынка для эффективного обмена на дефицитные товары. Мы надеемся на понимание в этом вопросе и его положительное решение.

Словом, реализация всего задуманного будет зависеть от поддержки акционеров биржи, а также от реальной заинтересованности предприятий агропромышленного комплекса, промышленности, строительства, малого и частного бизнеса в развитии биржевой деятельности в Республике Беларусь.

Мы вас ждем, деловые люди! Правление АО «Белагропромбиржа» предложит вам, уважаемые коллеги, выгодные условия сотрудничества. Звоните — телефон для справок в Минске 77-95-12 к вашим услугам. Адрес АО «Белагропромбиржа» — г. Минск, ул. Казинца, 86/1.

Петр СМОЛИК,
заместитель председателя правления АО «Белагропромбиржа».

Коратка

З прыбыткам, універсітэт!

У сувязі з дэпартызацыяй Узброеных Сіл камісары ў войску аказаліся непатрэбнымі. Спыніла сваю дзейнасць і Мінскае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча.

Улічваючы вострую неабходнасць умацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы вышэйшай школы, падрыхтоўкі кадраў, беларускі ўрад палічыў мэтазгодным перадаць вучэбныя карпусы, інтэрнаты і вытворча-бытавыя памяшканні гэтай вайсковай навучальнай установы Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту.

Як кажуць, з прыбыткам!

Вокруг квартирных метров

Глубже дышать не станем

В ПУБЛИКАЦИИ «Дышите глубже» («Народная газета» за 13 августа 1991 г.) кандидат технических наук И. М. Миранович говорит о несоответствии нормы жилой площади для постановки на квартирный учет (7 кв. м) действующим санитарно-гигиеническим нормам в Гомеле. Не оспаривая арифметические выкладки автора, все же хочу сказать, что автор публикации напрасно обвинил Гомельский облисполком и облсовпроф, принявших такое решение, в антигуманности. И вот почему.

Норма жилой площади, соответствующая всем санитарно-гигиеническим требованиям, установлена Верховным Советом БССР 22 декабря 1983 года. Она равна 12 кв. м на одного человека.

Названная цифра, однако, не может служить основанием для постановки на квартирный учет. Она является нормой пользования и применяется лишь при определении размера квартирной платы и излишней жилой площади, прописке временных жильцов, предоставлении жилых помещений в связи с капитальным ремонтом дома и собственникам сносимых домов.

Так что же тогда за норму утвердил Гомельский облисполком? И законно ли это он сделал? Если бы Миранович задался этими вопросами, то он бы выяснил, что учетная норма зависит, прежде всего, от местных условий, темпов жилищного строительства и многих других факторов. В разных регионах республики она различная. Например, в Минске — это 6 кв. м. В городах и поселках Брестской, Гомельской, Гродненской и Могилевской областей — 7 кв. м, в Витебске, Орше, Полоцке, Лепеле — 7,1 кв. м, в сельской местности Гродненской области — 8 кв. м на одного человека. Определяя эти цифры, облисполкомы опирались на закон и принимали во внимание наличие жилищного фонда, объемы ввода в эксплуатацию жилья, категории населенных пунктов, численность и темпы роста их населения, уровень и перспективы развития региона, обеспеченность трудовыми ресурсами.

Теперь о гуманности. Почему тот же Гомельский облисполком не может в настоящее время увеличить учетную норму? Да просто потому, что от ее изменения квартир не прибавится, а очереди на них и сроки получения резко возрастут и дышать глубже от этого никто не станет. Ведь объемы строительства жилья в республике, начиная с 1987 года, ежегодно уменьшались. И в основном это обстоятельство не дает основания органам Советской власти на местах поставить вопрос об изменении учетной нормы жилой площади.

Другое дело, что, несмотря ни на какие трудности, надо больше строить жилья. И обязательно соблюдать при этом нормативные требования.

Уместно сказать и о норме предоставления жилья, определяющей нижний и верхний пределы размера жилой площади в расчете на одного человека при предоставлении гражданам жилых помещений. Между этой и учетной нормой обязательно должен быть определенный разрыв, иначе может случиться, что семья, только что получившая квартиру, сразу же приобретает право для постановки на учет. Потому и существуют известные цифры — от 8 до 12 кв. м на одного человека.

Учетная норма не является единственным критерием для постановки на учет. Есть и другие для этого основания. Среди них, в частности, проживание в жилом доме, не отвечающем установленным санитарным и техническим требованиям, независимо от размера занимаемой площади.

Разумеется, все это пишется не для того, чтобы защитить учетную норму в 7 кв. м. Очень хотелось бы, чтобы «планка нуждаемости» ежегодно поднималась повыше, а очередь на жилье сокращалась. Но ведь только чернобыльская трагедия забрала у республики 120,6 тыс. кв. м общей жилой площади. Переселено на новые места около 100 тыс. человек. А по Государственной программе по преодолению последствий катастрофы на Чернобыльской АЭС на 1990—1995 годы еще нужно переселить до 1993 года 73,8 тыс. человек.

Немало есть изъянов в действующем жилищном законодательстве. Его нужно совершенствовать. И кое-что здесь уже делается.

Правительством республики постановлением от 9 августа 1991 года одобрена новая концепция жилищного строительства в Беларуси. В ней предусмотрено разделение функций между государством и гражданами в вопросах строительства и эксплуатации жилья и обеспечение права каждой семье и гражданину выбирать наиболее приемлемый для себя способ улучшения жилищных условий. На повестку дня все острее встает вопрос о формировании рынка жилья и приватизации жилищного фонда, что также нашло отражение в названной концепции. На практике сделано уже тоже немало. Объемы продажи государственного жилья в частную собственность постоянно возрастают: в 1989 продано 634 квартиры стоимостью 3,6 миллиона рублей, в 1990 году — 6824 за 42,1, а за первое полугодие текущего года — 7754 квартиры (дома) стоимостью 45,7 миллиона рублей (в том числе 1105 квартир передано безвозмездно и с частичной оплатой). Рассматривается вопрос о расширении приватизации жилья за счет продажи квартир во вновь вводимых в эксплуатацию жилых домах.

Все это дало мне основания уточнить некоторые высказывания кандидата технических наук И. Мирановича.

Виктор САВИЦКИЙ,
главный специалист управления территориального развития, архитектуры и строительства Управления делами Совета Министров Республики Беларусь.

В двух словах

ТАСС • «ИНФО-НОВА» • «НАРОДНАЯ ГАЗЕТА»

КГБ ПЕРЕДАЕТ ДАННЫЕ О СВОЕЙ АГЕНТУРЕ

Премьер Эстонии Эдгар Сависаар заявил, что в Москве, при встрече с председателем КГБ СССР Вадимом Бакатиным, было договорено о передаче эстонской стороне документов о деятельности КГБ в республике. Также будут выданы документы о лицах, сотрудничавших с этой организацией в Эстонии. Со стороны Москвы было только одно требование: эстонское правительство должно гарантировать секретность этих документов и обеспечить неприкосновенность тех лиц, чьи фамилии будут фигурировать в документах.

БЫЛА БЫ ЦЕЛЬ...

Латвия, Литва и Эстония приглашены в качестве наблюдателей на сессию Североатлантического блока, которая проходит в Мадриде, сообщила рижская газета «Диена». По словам председателя Комиссии Верховного Совета Латвии по оборонным и внутренним делам Талавса Юндзиса, Латвия «заинтересована обрести свое место в этой системе, чтобы получить определенные гарантии безопасности».

ДОГОВОРИЛИСЬ

Советский Союз и Латвийская республика договорились об установлении дипломатических отношений на уровне посольств.

В Москве соответствующими нотами обменялись министр иностранных дел СССР Борис Панкин и глава латвийского дипломатического ведомства Янис Юрканс.

«НЕ МОЖЕТ БЫТЬ И РЕЧИ...»

Президент Молдовы Мирча Снегур заявил, что «не может быть и речи об объединении Молдовы с другим государством». «Молдова проводит политику, направленную на утверждение своей независимости на мировой арене»,— сказал он, выступая перед представителями органов власти Дубоссарского района.

Президент расценил решение Народного фронта Молдовы, стоящего за немедленное объединение Молдовы с Румынией, бойкотировать назначение на 8 декабря всенародные выборы президента как очередную провокацию.

СКИНЕМСЯ ПО РУБЛЮ!

По призыву стачечного комитета студентов Латвийского университета в вузах республики начался сбор рублевых пожертвований в Фонд помощи республиканскому правительству. Акция, проходящая под лозунгом «Они нам — мы им», организована в связи с тем, что латвийские студенты с нынешнего учебного года лишены льгот при пользовании общественным транспортом. К тому же значительно повысилась плата за общежитие. В связи с этим студенты решили «помочь» неимущему правительству.

БЕЗ ТАБЛЕТОК И ПИЛЮЛЬ

Начал деятельность дальневосточный научно - исследовательский центр традиционной народной медицины «Эниом».

— Первое время лечение от различных недугов будут вести бригады опытных биоэнерготерапевтов из Московского центра народной медицины,— рассказывает директор дальневосточного «Эниома» Владимир Старостин.— Приезжая поочередно во Владивосток на три-четыре месяца, экстрасенсы столицы займутся исцелением сердечно-сосудистых, урологических, гинекологических и других недугов. Курс лечения напрочь отвергает химические препараты, таблетки и пилюли.

НЕТ ПРОБЛЕМ!

«Для нас проблемы «северных территорий» не существует как таковой,— сказал лидер депутатской группы «Россия» член Верховного Совета РСФСР Сергей Бабурин, вернувшийся из поездки по Сахалину и Курилам.— Есть проблема Курильских островов, и заключается она в их экономическом, социальном и культурном возрождении силами России и самих курильчан». По словам Бабурина, подавляющее большинство жителей Курил, с которыми ему удалось побеседовать, расценивают постановку вопроса о передаче этих островов Японии преступной.

«Другой вывод, сделанный нами во время поездки по Сахалину,— говорит Бабурин,— позволяет предположить, что экономическое чудо России все же возможно и что придет оно с Востока, но не из Японии, а с... Сахалина».

ПО КАМЧАТКЕ И ЧУКОТКЕ НА УПРЯЖКАХ

Малые предприятия «Берингия» на Камчатке и «Белый клык» на Чукотке выделили 100000 рублей в Фонд организации национальных гонок на собачьих упряжках. Маршрут, протяженность которого 1980 километров, пройдет от поселка Эссо на Камчатке до Марково на Чукотке. Гонки призваны возродить национальные обычаи, промыслы и культуру народов, населяющих эти земли.

Народная газета

В. Ф. КЕБІЧ:

«Ні пра які голад і гаворкі быць не можа»

(Даклад Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь аб эканамічным становішчы ў рэспубліцы)

Паважаны Старшыня!

Шаноўныя народныя дэпутаты!

Усе вы былі сведкамі таго, што ўрад неаднаразова звяртаўся ў Вярхоўны Савет, каб праінфармаваць парламент пра важнейшыя напрамкі сваёй дзейнасці, сацыяльна-эканамічныя абставіны ў рэспубліцы, праблемы і пра тыя меры, што ў сувязі з гэтым намі прымаюцца. Сумесны вопыт заўсёды дапамагаў знайсці аптымальны варыянт у вырашэнні найскладанейшых пытанняў нашай дзяржаўнасці.

Гэта датычыць перш за ўсё праграмы пераходу да рынку, стабілізацыі эканомікі, сацыяльнай абароны насельніцтва ў сувязі з рэформай рознічных цэн, аграпрамысловага комплексу.

Сюды ж можна аднесці серыю рашэнняў па пытаннях адукацыі, культуры, аховы здароўя і становішча тых, хто працуе ў гэтых галінах.

Зазначым, што толькі ў Беларусі ў значна большых памерах, чым у іншых рэгіёнах Саюза, былі павышаны заработная плата ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, пенсіі, стыпендыі і тым самым амаль не закрануты жыццёвы ўзровень большасці людзей.

Сёння мы маем сярэднямесячны даход на аднаго працаўніка 434 рублі. Гэта вышэй за даход іншых рэспублік, акрамя Прыбалтыкі. Але ж там і рознічныя цэны значна вышэйшыя, чым у нас.

Неабходнасць выпрацоўкі ўзгодненых поглядаў і ацэнак патрэбна заўсёды. Але сёння, ва ўмовах той палітычнай і эканамічнай сітуацыі, якая склалася, гэта асабліва важна. Цяперашняя абстаноўка, я сказаў бы, гэта згустак рознага роду складанасцей.

З аднаго боку — адбыліся сапраўды рэвалюцыйныя змены, гістарычную значнасць якіх пераацаніць проста нельга. Наш парламент, прыняўшы дзяржаўныя акты аб незалежнасці рэспублікі, вызначыў лёс беларускага народа на многія гады наперад.

Адкрыты шлях да сапраўднага нацыянальнага адраджэння, для такой перабудовы нашага грамадства, якая забяспечвала б усім людзям вартае іх жыццё.

Але з другога боку, той рэвалюцыйны рывок, які зроблены намі ў галіне палітычнай, у станаўленні нашай дзяржаўнасці, намнога апярэдзіў сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні.

Тут у нас вялікая несуадноснасць. Народная гаспадарка рэспублікі сёння аказалася ў становішчы, калі ў многім страчаны дынамізм і толькі цаной неймаверных намаганняў удаецца прытармазіць спад вытворчасці, жабрацкае становішча спажывецкага рынку і наогул зніжэнне ўзроўню жыцця чалавека.

Поўны распад усіх структур былога Саюза разняволіў наша грамадства, але разам з тым нарадзіў хаос у эканоміцы.

Да таго ж у многіх рэгіёнах замест таго, каб узяцца за актыўную перабудову эканамічных адносін, усю энергію выліваюць у палітычны запал, міжусобіцы, зводзяць рахункі за старыя крыўды. Таго і чакай, што асобныя ачагі грамадзянскай вайны перакінуцца на цэлыя народы.

Ці трэба казаць, наколькі гэта страшна і якімі цяжкімі вынікамі пагражае. Мала таго што ў вір нацыянальных канфліктаў уцягваюцца самыя працаздольныя сілы, дык пакутуюць ад гэтага і тыя, хто знаходзіцца за многія тысячы кіламетраў ад месцаў разладу, бо маюць пэўныя эканамічныя сувязі.

Так ужо склалася, што ў былым Саюзе мы аказаліся эканамічна стрыножанымі. Эканоміка Беларусі ўжо сёння церпіць вялікія страты ад таго, што не працуюць цэлыя прамысловыя раёны, з якіх мы атрымлівалі велізарныя пастаўкі.

Увесь гэты хаос, гэты жудасны непарадак, натуральна, хвалюе і нашых людзей. Яны занепакоены: ці зможам мы абараніць гаспадарку сваёй рэспублікі? Што чакае нас зімой? Ці пагражае Беларусі голад? Як складзецца праца прамысловых прадпрыемстваў? Якое фінансавае становішча?

Таму, мяркуючы ва ўрадзе, як нам найлепш данесці да Вярхоўнага Савета свае клопаты, свае задумы, мы прыйшлі да высновы, што пра ўсё трэба сказаць прама і на ўсе пытанні даць ясныя адказы.

Але перш за ўсё, напэўна, будзе правільным асэнсаваць тыя працэсы, што адбываюцца зараз у нашай эканоміцы.

Вядома, што народная гаспадарка рэспублікі ў вялікай залежнасці ад знешніх паставак паліўна-энергетычных і сыравінных рэсурсаў, мае надзвычай шырокі дыяпазон кааперацыйных сувязей.

Аднак тая акалічнасць, што мы змаглі заключыць эканамічныя пагадненні і дагаворы з многімі рэгіёнамі і непасрэднымі пастаўшчыкамі, дазволіла паслабіць націск разбуральных працэсаў.

Прынамсі, за трэці квартал у нас не было зніжэння прамысловай вытворчасці, а за мінулы перыяд года яно было намнога меншым, чым, скажам, у Расіі або на Украіне, не гаворачы пра Арменію, Грузію ці Малдову.

Валавая прадукцыя нашай сельскай гаспадаркі ацэньваецца за год са зніжэннем на 4 працэнты. Такі ж прагноз па будаўніча-мантажных работах.

За 9 месяцаў дасягнуты пэўны прырост па нехарчовых таварах, асабліва па выпуску складанай бытавой тэхнікі.

Як бачыце, агульны малюнак не з лепшых, але на фоне таго, што адбываецца навокал, не так ужо ўсё і змрочна.

Мы рабілі і будзем рабіць усё, каб змякчыць той цяжар, які на нас ціснe і ўзнікае практычна кожны дзень.

Але мы ніколі не будзем у змозе па-сапраўднаму вырашаць праблемы эканомікі рэспублікі як самастойнай дзяржавы, калі не будзем весці шырокамаштабныя работы па стратэгічных напрамках развіцця. З-пад сённяшняга цяжару мы абавязаны бачыць заўтрашні дзень.

І тут галоўнае месца аб'ектыўна адводзіцца глыбокай структурнай перабудове ўсёй нашай народнай гаспадаркі.

Сутнасць гэтай перабудовы ў тым, каб максімальна пераарыентаваць прамысловасць на непасрэдныя патрэбы рэспублікі, паступова аслабіць жорсткую залежнасць ад рэсурсаў, што ўвозяцца, стварыць надзейны экспартны патэнцыял.

Усё гэта закладзена ў вялікі дакумент у выглядзе асноўных напрамкаў развіцця машынабудаўнічага і хімічнага комплексаў, уключаючы канверсію абаронных прадпрыемстваў, праца над якім амаль закончана. Адначасова ідзе практычная рэалізацыя намечанага.

На выпуск острадэфіцытнай прадукцыі пераходзяць заводы «Магілёўсельмаш» і «Светлагорсккарммаш», хойніцкі завод «Салют». Ідзе асваенне новых відаў вырабаў на Мінскім трактарным заводзе, у аб'яднаннях «Гомсельмаш» і «Інтэграл».

Сумесна са спецыялістамі ФРГ распрацавана тэхналагічнае заданне па арганізацыі вытворчасці ў рэспубліцы легкавых аўтамабіляў, мікрааўтобусаў і мікрагрузавікоў на вольных плошчах, што ёсць на нашых прадпрыемствах.

Імкнёмся прыцягнуць да ўдзелу ў рэалізацыі гэтага праекта такія вядомыя фірмы, як «Опель», «Фольксваген», «Вольва», «Мерседэс-Бенц», «Форд». Усім гэтым фірмам накіраваны нашы прапановы. Зараз яны разглядаюцца.

Натуральна, што структурная перабудова эканомікі не адбудзецца сама па сабе. Для гэтага спатрэбяцца глыбокія змены ў фінансава-крэдытнай, падатковай, цэнавай палітыцы і пэўны час, каб спалучыліся розныя механізмы функцыяніравання народнай гаспадаркі.

Нягледзячы на тое, што будзе набіраць абароты рынак, не абысціся і без магутнай дзяржаўнай падтрымкі, каб гэтыя структурныя змены адбываліся як мага хутчэй і эфектыўней. Гэта робіцца ў выглядзе аблягчэння цяжару падаткаў і прадастаўлення іншай фінансавай зацікаўленасці. Тут намі распрацавана шмат мер.

Да нядаўняга часу ўрад быў пазбаўлены магчымасці прама ўздзейнічаць на вялікую частку нашай прамысловасці, якая знаходзілася ў падпарадкаванні саюзных міністэрстваў. Цяпер становішча пачало мяняцца ў звязку з рашэннямі Вярхоўнага Савета аб пераходзе пад юрысдыкцыю рэспублікі ўсіх прадпрыемстваў на яе тэрыторыі.

І адразу ж на ўрад зваліліся вялікае мноства новых праблем. Бо на гэтых жа прадпрыемствах працуе пятая частка ад усіх занятых у народнай гаспадарцы рэспублікі — звыш 1 мільёна чалавек, і даюць яны болей за 40 працэнтаў агульнага аб'ёму прамысловай вытворчасці.

Перш за ўсё трэба было ўзяць на сябе значную частку клопатаў па матэрыяльна-тэхнічнаму забеспячэнню і прыкласці шмат намаганняў, каб максімальна захаваць раней існуючыя кааперыраваныя пастаўкі.

Шэрагу прадпрыемстваў, з нагоды іх цяжкага фінансавага становішча, — такім, як Мінскае аб'яднанне вылічальнай тэхнікі, светлагорскае «Хімвалакно», барысаўскае «Экран», Беларускі металургічны завод, — давялося знізіць плацяжы ў бюджэт з прыбытку.

Мы павысілі аптовыя цэны на гатовую прадукцыю, каб кампенсаваць падаражанне завезеных матэрыялаў. На беларускіх заводах у нас зараз размяшчаецца вытворчасць многіх камплектуючых вырабаў, якія раней дзе толькі не выпускаліся.

Каб аператыўна вырашаць шматлікія пытанні, звязаныя з былымі саюзнымі прадпрыемствамі, урад мае ў сваім апараце групу спецыялістаў, якія пастаянна трымаюць кантакт з аб'яднаннямі і заводамі.

Ды і кіраўнікі вялікага шэрага прадпрыемстваў цяпер зусім па-іншаму падыходзяць і да ацэнкі сваіх праблем, і да вызначэння шляхоў іх вырашэння, зыходзячы з таго, што абавязаныя ў гэтых справах яны могуць толькі на рэспубліку, на сваю прадпрымальнасць, настойлівасць і кемлівасць.

Усё гэта разам узятае, безумоўна, дае свой эфект.

І наогул мы імкнёмся да таго, каб адносіны паміж дзяржаўнымі органамі і прадпрыемствамі ўсё больш грунтаваліся на эканамічным інтарэсе, каб не было дыктату ні з боку органаў дзяржаўнага кіравання, ні з боку прадпрыемстваў.

Тым больш што сёння любое прадпрыемства, разлічыўшыся з дзяржавай, як таго патрабуе закон, усе свае ўнутраныя праблемы павінна вырашаць само.

Спатрэбілася, напрыклад, вырашаць пытанні тарыфаў — ніхто не забароніць. Ёсць магчымасць павышаць заробкі або рабіць якія-небудзь іншыя даплаты — калі ласка, на здароўе.

Але, падкрэсліваю, усё гэта можна рабіць толькі пасля таго, як разлічышся з бюджэтам. Без гэтага ні адна дзяржава проста не можа існаваць.

У сувязі з канцэнтрацыяй непасрэдна пад юрысдыкцыяй рэспублікі ўсяго прамысловага патэнцыялу спатрэбіцца па-новаму падысці да навукова-даследчых і канструктарскіх арганізацый, каб узмацніць іх уплыў на навукова-тэхнічны прагрэс і яго выніковасць.

Дагэтуль фінансаванне работ, што імі вырашаліся, адбывалася ў асноўным за кошт бюджэту або цэнтралізаваных фондаў.

З пераходам ва ўласнасць рэспублікі вышэй азначаных арганізацый наша задача — не раскідаць кадры, не згубіць дасягнутае, наадварот, стварыць умовы для эфектыўнай працы спецыялістаў. Вельмі важна, каб іх распрацоўкі спрыялі пераходу ў найкарацейшы тэрмін на выпуск канкурэнтаздольнай прадукцыі, забяспечвалі б канверсію прадпрыемстваў.

Таму аб'ектыўна ўзнікла неабходнасць у стварэнні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхніцы. Зараз урад гэта пытанне разглядае.

Структурная перабудова нам патрэбна не толькі ў прамысловасці. Яна неабходна і ў сельскай гаспадарцы. Галоўнае тут — праблема ўстойлівага харчовага забеспячэння насельніцтва рэспублікі.

І тут, зноў жа, трэба хутчэй аслабіць нашу залежнасць ад завозу. У дадзеным выпадку маецца на ўвазе перш за ўсё збожжа, цукар і алей.

Па ўсіх гэтых пазіцыях мы маем канкрэтны план дзеянняў. Згодна з ім ужо з бягучага года пашыраюцца плошчы пад збожжавымі. Гэтак яшчэ гадоў дзесяць назад у нас было пад збожжавымі 3 млн. гектараў, а сёлета на паўмільёна менш. Калі браць у разлік нашу ўраджайнасць, гэта значыць, што мы недаатрымліваем каля мільёна тон.

Як у гэтым годзе са збожжам? Сабрана яго крыху больш за шэсць мільёнаў тон, на 800 тысяч тон менш, чым летась. Безумоўна, гэта ўскладніла становішча, тым больш што з завозам збожжа, які ў нас штогод складаў тры з паловай — чатыры мільёны тон, таксама складваюцца абставіны не лепшым чынам.

У выніку — такое становішча. Жыта на харчаванне нам хопіць да наступнага ўраджаю, а пшаніцы — з наяўных на сёння запасаў — толькі да 1 студзеня будучага года. Таму неабходна завезці на гэтыя мэты сама меней паўтара мільёна тон.

Але патрэбнасці ў завозным збожжы гэтым не абмяжоўваюцца. Трэба знайсці яшчэ хаця б мільён тон фуражнага зерня. Зараз падпісалі міжрэспубліканскае пагадненне па забеспячэнню харчовымі рэсурсамі, дзе прадугледжана завезці ў рэспубліку 4 мільёны тон збожжа.

Але ж самі разумееце, што сёння гэта яшчэ не цвёрдая гарантыя. Таму ўрад рэспублікі вядзе работу па пастаўках збожжа з Казахстана, Польшчы, Венгрыі, Чэха-Славакіі. У прыватнасці, у Польшчы ўжо закупілі 110 тысяч тон. Дасягнута дагаворанасць аб абмене з Украінай трохсот тысяч тон жыта на 280 тысяч тон пшаніцы і 15 тысяч тон круп.

Мы будзем рабіць так: мяса і іншую жывёлагадоўчую прадукцыю за межы рэспублікі пастаўляць толькі ў абмен на збожжа і кармавыя дабаўкі.

Ну, а наогул, як бы ні было складана, урад зробіць усё дзеля таго, каб збожжам рэспубліка была забяспечана.

Ёсць рэальная магчымасць аслабіць залежнасць і па завозу цукру. У свой час мы яўна недаацанілі ўласныя магчымасці і па пашырэнню пасеваў цукровых буракоў, і па нарошчванню магутнасцей па іх перапрацоўцы. Гэта цяпер выпраўляецца.

Што датычыць забеспячэння цукрам, то ў нас былі вялікія цяжкасці з-за недапаставак з Украіны і Расіі, але ўдалося часткова зняць іх дзякуючы прамому бартэрнаму абмену з Кубай. Продаж цукру выраўноўваецца.

Але нам трэба ўсё ж паглядзець і на спажыванне. Сёння [illegible] вышэй [illegible] па [illegible] здароўю, нічога гэта не прыносіць.

Намнога цяжэй з алеем. Свайго мы не вырабляем, а традыцыйныя пастаўшчыкі сёння ад нас адварочваюцца. [illegible] ідзём да іх на паклон і што-небудзь выбіваем. Але гэтага мала. Шукаем магчымасці закупкі алею за мяжой — у Турцыі, Грэцыі, Марока. Паступова будзем ствараць і сваю вытворчасць.

Па забеспячэнню мясам і малаком у нас ніякіх сумненняў няма. Нягледзячы на тое, што вытворчасць прадуктаў жывёлагадоўлі скарачаецца, [illegible] на будучы год [illegible] фондаў [illegible] прадукцыі [illegible]

[illegible] што ў нас не [illegible] харчаванне [illegible] на [illegible] 425 кілаграмаў малочных прадуктаў, 330—340 [illegible], 126 кілаграмаў хлеба і хлебапрадуктаў, 170 кілаграмаў бульбы і 75—80 кілаграмаў гародніны.

Такім чынам, ні пра які голад і гаворкі быць не можа.

Няма сёння рэальнай пагрозы і таго, што насельніцтва надыходзячай зімой будзе жыць у холадзе.

Каб гэтага не здарылася, у нас ужо ёсць пэўныя запасы паліва, а таксама дагаворанасці па электраэнергіі. Хаця, безумоўна, і тут шмат праблем.

Як, дарэчы, і ва ўсім матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні. Заключаныя дагаворы пастаянна парушаюцца, час ад часу даводзіцца звяртацца да бартэрнага абмену і адрываць ад сябе частку тых тавараў, якія патрэбны самім.

Хіба можа ў такой сітуацыі ўрад абысціся без таго, каб не ўстанаўліваць дзяржзаказ, які дазваляе хоць як-небудзь кіраваць у інтарэсах рэспублікі пастаўкамі нашай гатовай прадукцыі? Да таго ж і суседзі нашы, я маю на ўвазе Прыбалтыку, пакуль што без дзяржзаказу не абыходзяцца.

Мы прынялі праграму пераходу да рынку, і гэта для нас з'яўляецца генеральным накірункам. Але ўсе рынкавыя пераўтварэнні трэба весці з улікам рэальнасцей, абдумана, узважана, без падштурхоўвання.

У апошні час больш актыўна пайшоў працэс стварэння кааператываў, малых прадпрыемстваў і іншых форм малога бізнесу.

Нядаўна ўрадам зніжаны стаўкі падатку на прыбытак для шэрагу кааператываў. Устаноўлены льготы кааператывам, што выпускаюць спажывецкія тавары і аказваюць паслугі, а таксама ажыццяўляюць будаўніцтва і рамонт аб'ектаў аграпрамысловага комплексу і сацыяльнай сферы на сяле.

Цяпер кааператывы, зарэгістраваныя на тэрыторыі рэспублікі, набываюць матэрыяльна-тэхнічныя рэсурсы па тых жа аптовых цэнах, што і іншыя спажыўцы. Гэта значыць, без прымянення павышаных каэфіцыентаў. Ствараецца рэспубліканскі фонд фінансавай падтрымкі для малых прадпрыемстваў.

Урад будзе ўсё больш актыўна падтрымліваць прадпрымальніцтва і асабліва дробнае, бо мы надта зацікаўлены ў тым, каб у нас хутчэй фарміравалася такая структура вытворчасці, якая б працавала на задавальненне патрэб людзей і грамадства.

Асновай для рынку, як вядома, з'яўляюцца разнастайнасць форм уласнасці і канкурэнцыя таваравытворцаў. Таму на першы план тут вылучаюцца пытанні раздзяржаўлення і прыватызацыі.

Гэта вельмі тонкі інструмент, і з ім трэба абыходзіцца асцярожна. Паспешная, да таго ж без прававой асновы прыватызацыя непазбежна прывядзе да выбуху і ў эканоміцы, і ў палітычным жыцці грамадства.

Таму ўрад актыўна вядзе падрыхтоўку неабходнай прававой базы. І мы ўжо адчулі, чым можа абярнуцца яе адсутнасць.

Не так даўно былыя саюзныя структуры без узгаднення з урадам рэспублікі хуценька стварылі акцыянерныя суполкі і сталі іх удзельнікамі. Па меншай меры палова акцый гэтых суполак засталася б у Маскве. У гэтую справу было ўцягнута 10 буйных прадпрыемстваў. Безумоўна, нам давялося ўмяшацца і ўсё паставіць на месца.

Але, нягледзячы ні на што, прыватызацыю трэба рабіць. Таму мы зацвердзілі часовае палажэнне аб яе правядзенні. Праз Камітэт па кіраванню дзяржаўнай маёмасцю і мясцовыя Саветы пачалася прыватызацыя жылля. У гэтым годзе прададзена і перададзена ва ўласнасць без выплаты восем тысяч кватэр.

Гэта пакуль мізэрная колькасць у дзяржаўным жылым фондзе. Трэба шчыра прызнаць, што мы тут маглі б ісці хутчэй і больш садзейнічаць гэтаму. Зараз справа папраўляецца.

А вось як развіваюцца арэндныя адносіны. На арэнду перайшлі ўжо 78 прамысловых прадпрыемстваў з гадавым аб'ёмам вытворчасці больш за шэсць мільярдаў рублёў. Арэнднымі арганізацыямі выконваецца 9 працэнтаў усіх будаўніча-мантажных работ. Яны забяспечваюць чвэрць рознічнага тавараабароту, аказваюць трэцюю частку бытавых паслуг і выконваюць на транспарце каля паловы перавозак.

З арэндай некалькі прасцей. Па-першае, таму што справа гэта больш звыклая і, па-другое, у арандатара ёсць нейкая падстрахоўка ў выглядзе сувязей з арэндадаўцам. Гэтыя сувязі ў той або іншай меры застаюцца ў выпадках аказання дапамогі матэрыяламі, абсталяваннем, тэхнічным абслугоўваннем. Арэндныя адносіны развіваюцца больш актыўна, відаць, і таму, што, калі арандатара гэта не задавальняе, дагавор арэнды заўсёды можа быць спынены.

А вось калі тая ж майстэрня або цырульня будуць ўзяты ў прыватную ўласнасць, то іх уладальнік рызыкуе застацца адзін на адзін са сваімі праблемамі. Тое ж самае і з фермерствам.

І тут вельмі была б дарэчы дапамога мясцовых Саветаў, якія павінны падтрымаць прадпрымальніка. Але, як паказалі нашы нядаўнія праверкі ў Гродзенскай, Брэсцкай, іншых абласцях, у выканаўчай улады ўсё яшчэ поўная абыякавасць да новага, а то і перашкода яму.

Так, напрыклад, у Брэсцкай вобласці многа жадаючых стаць фермерамі, стварыць сялянскія гаспадаркі. Прычым гэта людзі вопытныя, добра ведаюць, як абыходзіцца з зямлёй. Але ім або прапаноўваюць няўдобіцы, або выдзяляюць лапікі, на якіх сапраўдны гаспадар і не разгорнецца. Сярэдні памер сялянскіх гаспадарак складае тут толькі 5,8 гектара сельгасугоддзяў, у той час як у адпаведнасці з законам грамадзяне могуць атрымаць на гэтыя мэты да пяцідзесяці гектараў.

Мы лічым, што цяпер, з прыняццем Вярхоўным Саветам пастановы аб прызнанні права прыватнай уласнасці на зямлю, пераўтварэнні ў сельскай гаспадарцы пойдуць намнога хутчэй. Трэба даць магчымасць працаваць на зямлі ўсім, хто ўмее і жадае.

А каб прыцягнуць у сельскагаспадарчую вытворчасць гараджан, мне здаецца, трэба зрабіць такі крок. Даць ім магчымасць узяць у сваё карыстанне некалькі гектараў зямлі, пры гэтым не пазбаўляючы людзей гарадской прапіскі. Тым больш, што ўжо сёння ў гарадах пачынае вызваляцца значная частка працоўных рэсурсаў, а прапіска ж з цягам часу згубіць усялякі сэнс.

Праз гады 3—4, калі мы пераканаемся, што гарадскі чалавек стаў сапраўдным гаспадаром, магчыма перадача яму зямлі ва ўласнасць. Добра было б, каб на гэтай зямлі абсталёўваліся людзі, якія выйшлі з гэтых мясцін.

Калі з боку парламента на ўсё гэтае будзе згода, мы маглі б адразу ж прыняць адпаведную пастанову і пачаць дзейнічаць.

Цяпер пра фінансавае становішча рэспублікі. Перш за ўсё пра бюджэт.

Па нашай ацэнцы, мы не пяройдзем за той бюджэтны дэфіцыт, які зацверджаны Вярхоўным Саветам. Перавышэнне выдаткаў над даходамі вызначаецца да канца года ў суме 4,3 мільярда рублёў.

Складаным застаецца пытанне пакрыцця гэтага дэфіцыту. Цяпер атрымана згода Дзяржбанка былога Саюза аб выдачы рэспубліцы кароткатэрміновай пазыкі ў памеры трох мільярдаў рублёў. У астатняй частцы бюджэтны дэфіцыт можа быць пакрыты за кошт павелічэння ўнутранага доўгу.

Безумоўна, пакрываючы бягучы дэфіцыт кароткатэрміновай пазыкай, мы рэзка абцяжарым будучы год, таму што вымушаны будзем адцягваць на пагашэнне фінансавыя рэсурсы, якія цяжка складваюцца і без таго. Вось чаму працягваем працаваць над тым, каб нам была прадастаўлена доўгатэрміновая пазыка.

Адначасова з прыцягненнем ў бюджэт даходаў урад удзяляе ўвагу стварэнню нармальных фінансавых умоў для функцыяніравання прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў. Гэта патрэбна і для саміх прадпрыемстваў, і не меней важна для папаўнення бюджэту.

Стварыліся льготы па падаткаабкладанню. Прычым у першую чаргу для падтрымкі тых прадпрыемстваў, якія выпускаюць прадукцыю для патрэб рэспублікі.

Разам з прадастаўленнем падатковых ільгот урадам прымаліся і іншыя меры фінансавай падтрымкі. За кошт прадугледжанага ў рэспубліканскім бюджэце фонду стабілізацыі выдзелена на падтрыманне цэн на фіксаваным узроўні Мінсельгасхарчу 134 млн. рублёў, Мінлегпраму — 220, Мінгандлю — 35, Белкаапсаюзу — 26, Мінхлебапрадукту — 24 млн. рублёў.

Каб ва ўмовах парушанага парытэту цэн не дапусціць развалу сельскай эканомікі, Савет Міністраў, як вы ведаеце, прыняў рашэнне выдзеліць аграпрамысловаму комплексу з бюджэту рэспублікі 3 мільярды рублёў. З гэтай сумы 2 мільярды 70 мільёнаў рублёў накіравана на ўстанаўленне надбавак да закупачных цэн на жывёлу, птушку, малако і асноўную прадукцыю земляробства.

Разам з тым выкананне бюджэту ўскладняецца з-за недапаступлення сродкаў у фонд фінансавай падтрымкі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. З прадугледжаных двух мільярдаў рублёў паступіла 340 млн. рублёў і чакаецца да канцы года яшчэ 400 — 500 млн. рублёў. Гэта, болей чым у два разы, менш намечанага. Даводзіцца шукаць крыніцы для пакрыцця гэтай нястачы.

Ва ўмовах адсутнасці пагаднення паміж удзельнікамі эканамічнага саюза ўсё цяжэй забяспечваць устойлівасць бюджэту.

Нядаўна нас паставілі перад фактам павелічэння аптовых цэн на нафту і нафтапрадукты, што паступаюць з Расіі, а гэта можа абярнуцца стратамі для бюджэту рэспублікі ў гэтым годзе амаль на 200 мільёнаў рублёў.

Немалыя страты нясём таксама ў сувязі з пастаянным павышэннем дагаворных цэн на бавоўну, воўну, скуру і іншыя сыравінныя рэсурсы, якія завозім.

У гэтых абставінах мы вымушаны процістаўляць у адказ свае меры. Гэта і пастаўка за межы рэспублікі нашай прадукцыі з надбаўкамі да цэн, і пераход на дагаворныя цэны замест фіксаваных.

Пазіцыя ўрада тут такая: увядзенне ў адносінах да нас дыскрымінацыйных мер па цэнах на сыравінныя рэсурсы павінна кампенсавацца вартасцю прадукцыі, што пастаўляецца за межы рэспублікі. Хаця, як разумееце, усё гэта павялічвае агульны грашовы абарот, стварае залішняе напружанне ў адносінах са спажыўцамі. На жаль, іншых сродкаў мы не маем.

У апошні час усё часцей паўстае пытанне пра нібыта нейкія празмерныя ўзносы рэспублікі ў саюзны бюджэт. Хацелася б далажыць, што ў параўнанні з іншымі рэспублікамі ў бягучым годзе мы дамагліся больш ільготнага становішча. Наша рэспубліка адзіная, якая не ўдзельнічае ў фарміраванні агульнасаюзнага фонду стабілізацыі (хоць расходы за кошт яго мы ажыццяўляем).

Не ўносім мы і фіксаванай долі сродкаў на агульнасаюзныя праграмы. Наш удзел абмяжоўваецца пералічэннем падатку на прыбытак па стаўцы 17 працэнтаў і 30 працэнтаў ад сумы падатку з продажу, а таксама даходаў ад знешнеэканамічнай дзейнасці.

Усяго за 8 месяцаў у саюзны бюджэт пералічана 2,4 мільярда рублёў. Сувымяраючы гэта з удзелам у выдатках на абарону, унутраныя войскі, кіраванне, іншыя агульнасаюзныя мерапрыемствы, мы бачым, што ў дадзеным выпадку ніякага закабалення для рэспублікі няма.

Да таго ж толькі на затраты па ліквідацыі чарнобыльскай катастрофы мы ўжо атрымалі ў гэтым годзе 2,3 мільярда рублёў.

Такая сітуацыя сёння. Надалей, самі разумееце, становішча мяняецца карэнным чынам. Няма Саюза — няма і плацяжу. Вось створым эканамічнае супольніцтва, тады будзем глядзець, якія плацяжы павінны быць, які іх памер і гэтак далей.

Рэальна ацэньваючы цяперашнюю фінансавую сітуацыю ў рэспубліцы, зусім відавочна, што без яе стабілізацыі, умацавання рубля, утаймавання інфляцыі не могуць быць рэалізаваны ніякія меры па аздараўленню эканомікі.

Выйсце з гэтай сітуацыі — у скаардынаваных дзеяннях суверэнных рэспублік па частцы гранічных узроўняў дэфіцытаў іх бюджэту і крыніц пакрыцця, крэдытнай палітыкі і ўзмацнення жорсткасці кантролю за грашовай масай, скарачэння неперашачарговых выдаткаў, удасканалення падатковага заканадаўства, цэнавай палітыкі, асабліва лібералізацыі цэн з адначасовым дзеяннем механізму дзяржаўнай сацыяльнай абароны насельніцтва з фіксаваным узроўнем даходаў.

Дагэтуль пралічана некалькі варыянтаў выдаткаў бюджэту на будучы год, і нам давядзецца выбіраць аптымальны. Але любы з іх выводзіць на дэфіцыт, які найменей у два разы перавышае цяперашні.

Галоўным у павелічэнні бюджэтных выдаткаў з'яўляецца тое, што ў сувязі з абвяшчэннем дзяржаўнай самастойнасці давядзецца фінансаваць за кошт сродкаў бюджэту рэспублікі выдаткі на ўтрыманне органаў дзяржаўнай бяспекі, пракуратуры, падраздзяленняў Міністэрства ўнутраных спраў, уключаючы ўнутраныя войскі, неабходна будзе браць на сябе ваенныя выдаткі і ўтрыманне многіх іншых структур, якія раней фінансаваліся з саюзнага бюджэту.

Пра інвестыцыі ў сувязі са станам бюджэту. Пераважная доля інвестыцыйных рэсурсаў фарміруецца ўжо сёння не на ўзроўні ўрада, а непасрэдна прадпрыемствамі і арганізацыямі, тым больш што магчымасці бюджэту надзвычай абмежаваныя.

Мы вымушаны будзем нейкім чынам знаходзіць сродкі для будаўніцтва сацыяльных аб'ектаў, а ўсё, што датычыць вытворчых, — з бюджэту давядзецца выключыць.

У нас ёсць намер прапанаваць Вярхоўнаму Савету ўвесці зусім новую падатковую сістэму, адпавядаючую эканамічным умовам, якія мяняюцца. Яна дазволіць забяспечыць пашыраную і больш устойлівую даходную базу бюджэту. Мы спадзяёмся, што дэпутаты падтрымаюць увядзенне такіх новых даходных крыніц, як падатак на дададзеную вартасць, акцызны падатак, падатак на нерухомасць, плату за выкарыстанне прыродных рэсурсаў.

Значныя змены ўносяцца і ў іншыя віды падаткаў. Адначасова прапаноўваецца адмяніць падатак з абароту, змяніць прынцыпы падаткаабкладання на прыбытак. На гэтым тыдні мы будзем абмяркоўваць дадзеныя пытанні з навукова-прамысловай асацыяцыяй.

Але нельга не ўлічваць і тое, што прыбытак расце хутчэй, чым поўніцца бюджэт. У бягучым годзе ў прамысловасці ён узрос амаль у два разы, а плацяжы з яго ў бюджэт толькі ў 1,7 раза. Амаль паўсюдна на рахунках прадпрыемстваў рэзка павялічыліся свабодныя рэшткі грошай, а бюджэт адчувае велізарныя цяжкасці. Тут, як бачыце, не ўсё ўвязана.

Шаноўныя народныя дэпутаты!

Вялікім клопатам урада з'яўляецца ўсё, што звязана з сацыяльнай абароненасцю насельніцтва. Становішча настолькі складанае, што гэтыя пытанні сталі галоўнымі ў нашай паўсядзённай дзейнасці і патрабуюць скрупулёзнага аналізу.

Агульны памер кампенсацый практычна пагасіў павелічэнне выдаткаў насельніцтва ў сувязі з красавіцкім павышэннем рознічных цэн.

І я павінен вам сказаць, што цэнавая рэформа для бюджэту нічога не прынесла, акрамя цяжкасцей і складанасцей. Калі разам скласці ўсе выплаты — і кампенсацыі, і павышэнне заработнай платы, пенсій і дапамог, гэта значыць усё тое, што ў поўнай меры было звязана з новымі цэнамі,— то агульная сума аказалася значна вышэйшай, чым паступленні ад павышэння цэн.

Калі да гэтага дадаць, што асноўную цэнавую прыбаўку атрымалі праз прыбытак непасрэдна прадпрыемствы, а не бюджэт, то ў немалой ступені існуючы сёння бюджэтны дэфіцыт народжаны праславутай паўлаўскай рэформай.

Я больш не хацеў бы закранаць рэформу, але зазначу, што цэны на асноўныя спажывецкія тавары выраслі ў гэтым годзе ў 1,7 раза, а даход насельніцтва ў выніку рознага роду выплат і кампенсацыі вырас больш чым у два разы.

Грашовыя даходы людзей, а яны склалі за 9 месяцаў 35 млрд. рублей пры тавараабароце і платных паслугах 23 млрд. рублёў, натуральна, шукаюць сферу прымянення. Урад робіць усё магчымае для таго, каб падтрымаць спажывецкі рынак. Больш як у мінулым годзе прададзена сёння тэхнічна складаных вырабаў, у тым ліку тэлевізараў і халадзільнікаў, а таксама шэрага іншых нехарчовых тавараў. Без асаблівых перашкод ідзе гандаль мясам, малочнымі прадуктамі, хлебам і хлебабулачнымі вырабамі.

Але становішча на спажывецкім рынку вельмі цяжкае. Шмат чаго не хапае. Прылаўкі магазінаў пустыя, і гэта выклікае справядлівае незадавальненне.

Зразумела, калі параўнаць тое, што мы вырабляем і пастаўляем гандлю, будзе відавочна: становішча з забеспячэннем нашага насельніцтва было б значна лепшае. Нягледзячы на ўсе прынятыя намі меры, шмат тавараў вывозіцца. Бо на кожнай сцежцы кантрольны пункт не выставіш. Да таго ж такіх пунктаў няма на чыгунцы. Гэтым і карыстаюцца.

Усё гэта яшчэ раз пераконвае ў тым, што нам трэба хутчэй уводзіць у поўным аб'ёме ўсю сістэму ўласнай пагранічна-мытнай аховы. Работа гэта пачалася.

Апрача таго, будзем дамаўляцца з рэспублікамі аб каардынацыі ўзроўню цэн на асноўныя тавары.

Урад вельмі турбуюць праблемы аховы насельніцтва ад раз'юшанай злачыннасці. Дэпутаты падымаюць на гэты конт слушныя пытанні і правільна выказваліся пры назначэнні Генеральнага пракурора.

Зазначу: становішча не з лёгкіх. Але пасля таго, як мы здолелі вызначыць асноўныя напрамкі нашых дзеянняў, матэрыяльна падмацаваць міліцыю, становішча стала лепш кантраляваецца. Нешта абнадзейваючае паявілася.

Цяпер некалькі менш забойстваў, злачыннасці на вуліцах. Але да сур'ёзнага паляпшэння ўсёй справы яшчэ далёка.

Бясспрэчна, міліцыю трэба значна лепш тэхнічна аснасціць. Гэта робіцца.

Але трэба ўсвядоміць, што толькі з дапамогаю міліцыі мы са злачыннасцю не справімся. Злачыннасць — гэта адлюстраванне сацыяльна-эканамічнага становішча. Трэба перш за ўсё яго палепшыць, тады і злачыннасці будзе менш. Якраз ў гэтым мы бачым сваю галоўную задачу.

Пераход да рынкавых адносін з усёй вастрынёй паставіў пытанні занятасці насельніцтва. І гэта непазбежна, паколькі рынак — не толькі новыя адносіны ў эканоміцы, але і яе глыбокая перабудова, якая непазбежна суправаджаецца пераразмеркаваннем рабочай сілы. На нейкі кароткі прамежак часу той або іншы работнік можа аказацца незанятым на вытворчасці. Так яно ўжо і ёсць.

Але я катэгарычна супраць таго, каб праблему беспрацоўя раздзімалі, нагняталі страх.

Тое беспрацоўе, якое ў нас узнікла і мае чыста лакальны характар, звязана часцей за ўсё з пераходамі на іншую работу, і мы не дапусцім, каб нашы цэнтры працаўладкавання ператварыліся ў канторы па выдачы дапамог. Нам такія канторы не патрэбны. Нам патрэбна, каб цэнтры аператыўна дапамаглі чалавеку ўладкавацца на працу, тым больш, што ў нас незанятых рабочых месц у прамысловасці, у будаўніцтве, у сельскай гаспадарцы дастаткова.

Мы не настолькі багатыя, каб мець беспрацоўе як маштабную з'яву. Трэба ўсім зразумець, што раскошу мець такое беспрацоўе можа дазволіць сабе толькі эканоміка, дзе ёсць перавытворчасць. Калі ж грамадства беднае, то павышэнне эфектыўнасці вытворчасці за кошт яго скарачэння — гэта абсурд, гэта вынік дрэннага, бяздарнага кіравання.

Нам неабходна пазбаўляцца ад стэрэатыпаў масавага мыслення. Неабходна іншая жыццёвая філасофія, у якой бы перамена працы і нават ладу жыцця расцэньвалася як з'ява абсалютна нармальная, якая не толькі не пагражае крахам, а нават дае чалавеку шанц праявіць сябе ў новых абставінах, раскрыць свой патэнцыял, свае магчымасці.

У вырашэнні ўсіх сацыяльных пытанняў і перш за ўсё тых, што датычаць працуючага чалавека, павінна ўзрасці роля прафсаюзаў. Урад усяляк садзейнічае гэтаму. Заключана пагадненне з Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі. Ніводзін праект заканадаўчых актаў, якія датычаць працоўных праблем альбо праблем занятасці не разглядаецца ўрадам без удзелу прафсаюзаў. Так ёсць, і так будзе надалей.

Але мы ўсё больш і больш пераконваемся, што манапалізм прафсаюзаў такі ж шкодны, як і манапалізм вытворчасці. І шкода гэта ўзрастае, калі лідэры прафсаюзаў імкнуцца ад імя тысяч працаўнікоў на хвалі голага папулізму парушыць тую, яшчэ зусім кволую, сацыяльную раўнавагу, якую Вярхоўнаму Савету і ўраду на аснове кансалідацыі сіл пры падтрымцы большасці насельніцтва ўдалося стварыць.

Лічу, што дэпутаты павінны яшчэ раз уважліва перагледзець праект Закона аб прафсаюзах, каб Закон не даваў аніякіх падстаў для манапалізму. Гэта будзе толькі на карысць справе.

Паважаныя народныя дэпутаты!

Тое кола пытанняў у галіне эканомікі, фінансаў, сацыяльных праблем, якое ўзнята ў гэтым дакладзе, па сутнасці з'яўляецца зместам нашай дзяржаўнасці. І вельмі важна, каб прававыя асновы, нашы адносіны з іншымі дзяржавамі дазвалялі вырашаць праблемы так, як таго патрабуюць карэнныя інтарэсы Рэспублікі Беларусь.

Што датычыць заканадаўчай базы, то такая работа вядзецца. І на разгляд гэтай сесіі Вярхоўнага Савета ўнесены шэраг праектаў законаў, якія маюць прамыя адносіны да нашай дзяржаўнасці і незалежнасці рэспублікі.

Больш складана з фактычнай рэалізацыяй дзяржаўнасці. Тут усё можна было б умоўна раздзяліць на тры буйныя блокі. Гэта — рэалізацыя дзяржаўнасці ў галіне эканомікі, знешняй палітыкі і знешнеэканамічных сувязей, арганізацыя абароны дзяржаўных інтарэсаў рэспублікі.

Коратка пра тое, як мы гэта ўсё разумеем.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

«Ні пра які голад і гаворкі быць не можа»

(Даклад Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь аб эканамічным становішчы ў рэспубліцы)

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

У галіне эканомікі — гэта нарошчванне нашага патэнцыялу і што мае асабліва важнае значэнне, дык гэта стварэнне здаровых эканамічных адносін з незалежнымі рэспублікамі былога Саюза. Тут у нас вялікі інтарэс. Без выгаднага партнёрства нам не абысціся, і гэта ведаюць усе. Вось чаму нам вельмі патрэбны дагавор аб эканамічным супольніцтве.

Па даручэнню Прэзідыума Вярхоўнага Савета я, як кіраўнік урада, актыўна падтрымаў алма-ацінскую сустрэчу і праект, што на ёй разглядаўся. Тым больш што і ў ходзе самой сустрэчы і пры падрыхтоўцы праекта дагавора мы выказвалі шэраг заўваг, і яны ўлічаны. Таму мяркую, што чым раней будзе падпісаны дагавор, тым лепш. Гэта прынясе карысць для ўсіх.

Дарэчы, у нашых адносінах з рэспублікамі можа ўзнікаць і ўжо ўзнікае шэраг пытанняў, якія выходзяць за рамкі гаспадарчых сувязей. Гэта паказалі апошнія падзеі ў Чарнобылі.

Вы ведаеце, што некалькі дзён таму назад на Чарнобыльскай АЭС узнік пажар. Па даных спецыялістаў і прадстаўнікоў рэспублікі, якія туды былі накіраваны, радыяцыйнай небяспекі на гэты раз не ўзнікла. Аднак тое, што здарылася, яшчэ раз востра нагадала аб тым, што страшэнная пагроза працягвае існаваць.

Станцыя зараз з'яўляецца ўласнасцю Украіны, і цяпер Украіна нясе адказнасць за ўсё, што адбываецца. Лічу, што неабходна на самым высокім, парламенцкім, узроўні дамовіцца аб поўным спыненні эксплуатацыі гэтай станцыі і дэмантажы абсталявання.

Трэба таксама неадкладна пачаць распрацоўку прававых дакументаў, у якіх была б зафіксіравана адказнасць Расіі і Літвы наконт магчымых экалагічных і іншых вынікаў эксплуатацыі Смаленскай і Ігналінскай атамных станцый.

У галіне знешняй палітыкі, па меркаванню ўрада, нам патрэбна вельмі дэталёва разабрацца з усімі пытаннямі, бо ўсё, што рабілася дагэтуль, мае вельмі мала агульнага з незалежнай дзяржавай.

За мяжой пакуль вельмі асцярожна ставяцца да працэсаў, якія адбываюцца ў рэспубліцы. Многія дзяржавы занялі ў асноўным пазіцыю чакання. Рэальнасць такая, што мы павінны зрабіць усё для таго, каб паскорыць прызнанне Беларусі іншымі дзяржавамі, якія ўсё яшчэ бачаць нас састаўной часткай Саюза. Між тым у нас ёсць гісторыя самастойных дыпламатычных адносін. У пачатку 20-х гадоў рэспубліка мела іх з дзевяццю еўрапейскімі дзяржавамі.

Бліжэйшую задачу мы бачым у тым, каб пераламаць становішча, наладзіць кантакты з усімі дружалюбнымі дзяржавамі і перш за ўсё развіваць і ўмацоўваць іх з нашымі суседзямі.

У нас нядрэнныя адносіны з прыбалтыйскімі рэспублікамі, і мы іх будзем развіваць далей.

Традыцыйна цесныя сувязі існуюць у рэспублікі з Польшчай. У нас узаемаразуменне з цяперашнім яе кіраўніцтвам. Гэта пацвердзіў мой нядаўні візіт у Польшчу. Падпісаны Дэкларацыя аб асновах добрасуседскіх адносін і пагадненне аб гандлі і эканамічным супрацоўніцтве. Адбыліся сустрэчы з прэзідэнтам Польшчы Лехам Валенсам і прэм'ерам Кшыштафам Бялецкім, якія насілі выключна адкрыты і сяброўскі характар.

У галіне знешнеэканамічных сувязей урад бачыць сваю галоўную задачу ў тым, каб выклікаць у развітых дзяржаў інтарэс да эканамічнага супрацоўніцтва з намі і прыцягнуць дзелавыя колы гэтых краін да ўдзелу ў тых глыбокіх пераўтварэннях, якія мы праводзім. І тут нас асабліва цікавіць вопыт тых дзяржаў, якія здолелі, не маючы буйных запасаў мінеральна - сыравінных рэсурсаў, у кароткія тэрміны трывала паставіць на ногі свае нацыянальныя эканомікі, ажыццявіць сапраўды грандыёзны прарыў да росквіту.

Гэтаму і служылі паездкі ўрадавых дэлегацый у Японію і Рэспубліку Карэя. Калі хочаце, карэйскі вопыт, асабліва па падабенству стартавых умоў, для нас выключна прымальны.

Зразумела, гэта не значыць, што нас цікавяць толькі названыя краіны. У нас ужо створана добрая аснова для эканамічнага супрацоўніцтва з многімі дзяржавамі. Што датычыць краін Усходняй Еўропы, то тут, зразумела, асаблівыя прыярытэты.

У справе непасрэднай абароны нашай маладой дзяржавы ёсць таксама вельмі многа праблем. Вось чаму ўрад працуе над тым, каб як мага хутчэй вырашыць усе пытанні, звязаныя з аховай меж і арганізацыяй мытнай службы.

Больш складанае становішча з арміяй. Мне здаецца, неабходна ў Вярхоўным Савеце вызначыцца ў галоўным. Што я маю на ўвазе? Як і для любой дзяржавы, утрыманне арміі — вельмі цяжкая нагрузка для бюджэту. Дапусцім, што гэту нагрузку возьмем. Але калі мы стаім на тым, што наша рэспубліка павінна быць бяз'ядзернай і нейтральнай, то трэба зусім дакладна ўсвядоміць: ці патрэбна нам шматлікая армія?

А што датычыць цяперашняга становішча ваеннаслужачых, то мы ва ўрадзе добра разумеем, наколькі яно цяжкае, і, па меры магчымасцей, імкнёмся дапамагчы ваеннай акрузе ў гэтых клопатах.

Перабудова эканомікі, станаўленне незалежнай дзяржавы аб'ектыўна патрабуюць фарміравання і адпавядаючай гэтым працэсам структуры кіравання. Урад зараз такую работу вядзе, па многіх напрамках яна ўжо завяршаецца, і ў бліжэйшы час гэтыя пытанні будуць вынесены на разгляд Вярхоўнага Савета. Адначасова запрашаю да работы ва ўрадзе, прычым на любым узроўні, прадстаўнікоў усіх палітычных груп і плыней, прадстаўленых у нашым парламенце, у тым ліку, вядома, і апазіцыю.

Паважаныя дэпутаты! Як бачыце, і ў эканоміцы, і ў сацыяльнай сферы, і ў станаўленні дзяржаўнасці перад намі маса спраў. Справіцца з імі нялёгка. Сёння літаральна ва ўсім патрэбны дзяржаўная мудрасць, разлік і абачлівасць. Зараз як ніколі патрабуецца адзінства дзеянняў парламента і ўрада. Па-мойму, асновы для гэтага закладзены, і мы павінны іх эфектыўна развіваць.

Дзякуй за ўвагу.

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб парадку дня сёмай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Уключыць у парадак дня сёмай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання наступныя пытанні:

1. Аб выбранні першага намесніка Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.
2. Аб выбранні Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь.
3. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь».
4. Даклад Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь аб эканамічным становішчы ў рэспубліцы.
5. Аб аварыі на Чарнобыльскай АЭС.
6. Аб матэрыяльна - бытавым забеспячэнні работнікаў суддзяў і органаў пракуратуры Рэспублікі Беларусь.
7. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароненасці інвалідаў у Рэспубліцы Беларусь».
8. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прававым рэжыме тэрыторый радыеактыўнага забруджання».
9. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці».
10. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб замежных інвестыцыях на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь».
11. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб парадку заключэння, выканання і дэнансацыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь».
12. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб адукацыі».
13. Аб перападпарадкаванні Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.
14. Аб святочных днях у Рэспубліцы Беларусь.
15. Аб праекце Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Рэспублікі Беларусь.
16. Аб датэрміновым вызваленні ад абавязкаў члена Гомельскага абласнога суда.
17. Аб павелічэнні колькасці членаў Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь.
18. Аб праекце пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб адхіленні ад пасады дэпутата ў Халопеніцкім пасялковым Савеце народных дэпутатаў Крупскага раёна Мінскай вобласці».
19. Аб праекце пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб заснавальніках газет «Звязда» і «Советская Белоруссия».
20. Аб утварэнні Часовай камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па расследаванню дзейнасці некаторых службовых асоб Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па эканоміцы і планаванню і падпарадкаванага яму пансіната «Лясное».
21. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб падатках з прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый».
22. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб падаходным падатку з грамадзян».
23. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб падатках з юрыдычных і фізічных асоб».
24. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб відах маёмасці, якая не можа знаходзіцца ў прыватнай уласнасці».
25. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб каштоўных паперах і фондавай біржы».
26. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб таварнай біржы ў Рэспубліцы Беларусь».
27. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб плацяжах за зямлю».
28. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прыватызацыі жыллёвага фонду ў Рэспубліцы Беларусь».
29. Аб праекце пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб размеры адлічэнняў у Дзяржаўны фонд садзейнічання занятасці».
30. Аб пяціпрацэнтным падатку з продажу.
31. Аб праекце пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні Палажэння аб Камісіі пры Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь па аказанню садзейнічання ў забеспячэнні правоў ахвяр палітычных рэпрэсій 20—80-х гадоў і ўвекавечанні іх памяці».
32. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні грамадзян у Рэспубліцы Беларусь».
33. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе веравызнання і рэлігійных арганізацыях».
34. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прафесіянальных саюзах».
35. Інфармацыя аб праведзенай рабоце Часовай камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па вывучэнню дзейнасці ЦК КПБ і падтрымліваных ім грамадска-палітычных устаноў, арганізацый, дзяржаўнай улады і кіравання, службовых асоб і грамадзян.
36. Аб Камуністычнай партыі Беларусі.
37. Аб праектах пастаноў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь аб эталоне Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, аб праекце Палажэння аб Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь, аб пячатках Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і яго Прэзідыума.
38. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльных гарантыях ветэранаў вайны, працы і Узброеных Сіл».
39. Аб праекце пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб беларускай мове ў дзяржаўных сродках масавай інфармацыі».
40. Аб Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь.
41. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай службе».
42. Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з прапановамі органаў і асоб, якія валодаюць правам заканадаўчай ініцыятывы (пералік праектаў прыкладаецца).

Дадатак да пункта 42 пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 15 кастрычніка 1991 года «Аб парадку дня сёмай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання»

ПЕРАЛІК праектаў заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь

1. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС».
2. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь у сувязі з прыняццем Законаў Рэспублікі Беларусь «Аб уласнасці ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб прадпрымальніцтве ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы ў Рэспубліцы Беларусь» і «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь».
3. Аб праекце пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Часовы рэгламент Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь».
4. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прызнанні страціўшымі сілу некаторых заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь».
5. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь па пытаннях аховы мацярынства і дзяцінства і дзяржаўнай дапамозе сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей».
6. Аб праекце пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб частковым змяненні пастановы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь «Аб парадку ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб мясцовым самакіраванні і мясцовай гаспадарцы ў Рэспубліцы Беларусь».
7. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб парадку апублікавання і ўступлення ў сілу законаў і іншых актаў, прынятых Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь і яго органамі».
8. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб асноўных прынцыпах народаўладдзя ў Рэспубліцы Беларусь».
9. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь у сувязі з прыняццем Закона Рэспублікі Беларусь «Аб міліцыі».
10. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў у артыкулы 5 і 212 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях».
11. Аб праекце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях у сувязі з прыняццем Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы».

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

15 кастрычніка 1991 г.
гор. Мінск.

ПАСТАНОВА
Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь
Аб выбранні Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Выбраць Генеральным пракурорам Рэспублікі Беларусь Ігнатовіча Мікалая Іванавіча, вызваліўшы ад гэтых абавязкаў Тарнаўскага Георгія Сцяпанавіча.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

15 кастрычніка 1991 г.
гор. Мінск

Генеральны пракурор Рэспублікі Беларусь Ігнатовіч Мікалай Іванавіч

Ігнатовіч М. І. нарадзіўся ў 1940 годзе ў вёсцы Адахоўшчына Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Беларус. Адукацыя вышэйшая. У 1968 годзе закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна. Спецыяльнасць па адукацыі — юрыст.

Працоўную дзейнасць пачаў у 1958 годзе аўтаслесарам Баранавіцкага рамонтнага завода. 1959—1962 гады — служба ў Савецкай Арміі. Пасля службы працаваў рабочым. З 1964 па 1968 год вучыўся на юрыдычным факультэце БДУ. У 1968—1970 гадах працаваў адвакатам-стажорам Віцебскай гарадской юрыдычнай кансультацыі, загадчыкам Бешанковіцкай раённай юрыдычнай кансультацыі. З 1970 года — следчы Слуцкай міжраённай пракуратуры Мінскай вобласці, а з 1973 года — старшы следчы Мінскай абласной пракуратуры. 1976—1989 гады — следчы па асабліва важных справах пры Пракуратуры БССР.

М. І. Ігнатовіч — народны дэпутат СССР.

З 1989 года з'яўляецца членам Вярхоўнага Савета СССР.

1989—1990 гады — член Камітэта Вярхоўнага Савета СССР па галоснасці, правах і зваротах грамадзян.

У 1990 годзе выбіраецца старшынёй Камісіі Вярхоўнага Савета СССР па пытаннях прывілей і льгот.

Факт

НАСМЕШКИ ИЗ ГОСТОРГОВЛИ

В эти дни московская госторговля проявляет трогательное внимание к самым малоимущим слоям населения. По заявкам ветеранов и инвалидов, стоящих в очередях ни один год, магазины предлагают холодильники, телевизоры и другие дефицитные товары. Однако радость омрачается, как только люди узнают о ценах. Импортный холодильник стоит, например, 4 тысячи рублей, а за телевизор надо выкладывать от двух до трех тысяч.

Большинство бедняков вынуждены отказываться от покупок.

И еще одна проблема ожидает москвичей. По всем прогнозам, многие семьи не смогут поставить на новогодний стол бутылку шампанского. Вместо запланированных бутылок искристого вина торговля еле «наскребет» половину.

Федор ЛЕОНИДОВ.

Нам стало известно

Чернобыль и «утопическая» идея

Необычную идею, касающуюся ликвидации последствий чернобыльской катастрофы, выдвинули сотрудники Белорусского отделения ВНИИ «Энергосеть» и НИИ комплексного использования водных ресурсов.

Они предложили создать 16 крупных водохранилищ в бассейнах рек Днепр, Припять, Сож и их притоков, чтобы затопить водой наиболее зараженные радионуклидами земли площадью около 6 тысяч км². Основные доводы в пользу предполагаемого проекта: республика будет обеспечена недостающей электроэнергией после строительства на водохранилищах нескольких гидроэлектростанций, законсервируются от ветровой эрозии земли...

На расширенном заседании Экологической комиссии Академии наук Республики Беларусь было рассмотрено это предложение. Ученые и специалисты сошлись во мнении, что реализация подобного проекта может вызвать непредсказуемые экологические последствия. Затопление огромных территорий приведет к заболачиванию окрестных земель, водохранилища станут сорбентами рек России, Украины, консервантом, а не нейтрализатором радионуклидов. Под водой окажется часть еще пригодных для сельскохозяйственного производства земель, а также большая площадь лесов. Да и строить ГЭС на равнинных реках, как показывает практика, невыгодно.

«Утопическая» идея ученых-проектантов оказалась несостоятельной. Но, как заметил старший научный сотрудник, член Экологической комиссии Академии наук Сергей Богданов, она родилась не на пустом месте и примечательна уже тем, что дала толчок поиску новых путей решения чернобыльской проблемы. Ведь до сих пор нет комплексной программы природопользования в зоне особого внимания.

Виктор ЗАГРАДСКИЙ.

Когда меньше говорят, а больше делают

Островок благополучия?

Осень. Середина сентября. Самый разгар овощного сезона. А в Минске нет капусты.

Но стоило зайти в магазин № 11 Заводского оптово-розничного плодоовощного комбината, и открылась совсем иная картина. Лук, чеснок, помидоры, картофель, капуста, морковь, свекла, арбузы, дыни, перец. Как на восточном базаре, всего и не перечислишь.

Заведующая магазином Надежда Михайловна Пальчик в заботах. Прибыл большегрузный автомобиль из Молдовы, надо срочно разгружать. Здесь не до разговоров. И все же.

— Откуда такое изобилие? —интересуюсь у Надежды Михайловны.

— Мы не ждем ни от кого милостыни,— отвечает.— Заключаем прямые договора с овощеводческими хозяйствами «Волма» и «Рассвет». Минуя многочисленные инстанции, они нам все завозят, можно сказать, с грядок.

— А как с Молдовой?

— Тоже личные контакты и прямые договора. Если надо, сами к ним едем, созваниваемся по телефону. Идут на контакт очень охотно. Ведь такие договора им тоже выгодны.

— Как относится к подобному вашему творчеству родной РПК?

— С долей понимания. Они тоже хотели бы нас обеспечивать всем необходимым. Даже договор есть на этот счет. Да разве в нашей бюрократической рутине можно развернуться тому же РПК? Одних согласований по инстанциям сколько. Любой овощ от кочевки со склада на склад погибнуть может.

— Не ропщут ли работники магазина на вашу строгость?

— Что вы. У нас за несколько последних лет ни один человек не ушел из коллектива. И ни разу я не слышала ни от кого жалоб на трудности. Надо расфасовать товар — все становимся и фасуем. Покупатель должен иметь максимум удобств. А мы их создаем для того, чтобы и в следующий раз люди не прошли мимо магазина.

Вот такое быстрое экспресс-интервью. Но оно полностью характеризует стиль работы Надежды Михайловны Пальчик и всего трудового коллектива магазина № 11, который, кстати, по итогам работы за прошлый год был удостоен третьего места в городе.

Так что если будете в Минске, в районе универмага «Беларусь», заверните на улицу Жилуновича. Не пожалеете.

Виктор ХОРОШКО.

Задумаемся, людзі!

ЖАБРАЦТВА... ПРЫ БАГАТАЙ СПАДЧЫНЕ

Як адрадзіць згублены пласт беларускага музычнага мастацтва?

Раскрыйце энцыклапедыю «Літаратура і мастацтва Беларусі». Артыкул «Барока» расказвае аб архітэктуры, выяўленчым, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, графіцы, літаратуры. А што ж музыка? Тое-сёе пра канты і псалмы — вось і ўсё. Не названа ніводнага прозвішча, ніводнага твора.

Паводле артыкулаў «Ракако» і «Класіцызм», у гэтыя эпохі на Беларусі музыкі не было зусім. Эпоха «Сентыменталізму» прадстаўлена лібрэта без музыкі В. Дуніна-Марцінкевіча да оперы С. Манюшкі «Сялянка». І толькі «Рамантызм» называе некалькі імёнаў і твораў. Пра тых музыкантаў, якія працавалі ў гэтыя эпохі на Беларусі, энцыклапедыя дае звесткі такім чынам, што незразумела, якія ж яны маюць адносіны да музычнага мастацтва Беларусі. Вось, напрыклад, Напалеон Орда. Самыя дасведчаныя, напэўна, успомняць аб яго работах у выяўленчым мастацтве. Але ці ведаем мы, што музыка ў яго жыцці таксама адыгрывала вялікую ролю? Некаторы час ён быў дырэктарам італьянскай оперы ў Парыжы. Быў вучнем Шапэна, сябраваў з Лістам, пісаў рамансы (пераважна на вершы Адама Плуга), серэнады для фартэпіяна. Вось і трэба, каб пра яго і іншых прафесіяналаў-музыкантаў тых стагоддзяў ведалі цяпер. Пра тых, аб кім так сціпла маўчаць фундаментальныя артыкулы энцыклапедыі, сцвярджаючы: прафесійнае музычнае мастацтва на Беларусі з'явілася пасля Кастрычніка. І кропка. Вось што аб гэтым гаворыцца ў артыкуле «Музыка»: «...Першымі прадстаўнікамі музычнай прафесіі былі вандроўныя акцёры-музыканты, скамарохі, спевакі... Значную ролю адыгралі прыгонныя тэатры, капэлы, аркестры...» Вось гэта ўжо цяплей. Звернемся па дапамогу да інфармацыі і логікі.

